ЛІТАРАТУРА і мастацтва

ЛіМ

23 снежня 2005 г. № 51-52/4338-4339

АНОНС!

І ўрэшце, чаму зацятая пазіцыя некалькіх дзесяткаў чалавек павінна складаць уражанне апазіцыйнасці соцень пісьменнікаў? Зыходзячы з народнай прымаўкі: "У гурце і бацьку лацвей біць"?..

Дадам, што ўсё гэта рабілася на фоне недаравальнай безгаспадарчасці, калі даводзілася да стану разбуранай Пампеі наша неацэнная маёмасць — Дом творчасці "Іслач".

Карацей, пытанняў наспела дужа багата. Ды вось бяда — няма каму задаць іх, а вырашаць — тым больш. Шмат хто разумеў бязвыхаднасць становішча, і наспела адэкватнае рашэнне.

СТАР. 5

Падзея, якая ва ўсіх на вуснах: маленькая грамадзянка Беларусі Ксенія Сітнік стала першай на папулярным конкурсе "Еўрабачанне-2005". Дарэчы, яшчэ пасля перамогі на Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка", які праходзіў у Магілёўскай вобласці, гэтая зорачка з Мазыра стала стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Сапраўды, таленты-самародкі не ўзнікаюць на "зорным небасхіле" ніадкуль. Дзеці не нараджаюцца мастакамі ці музыкантамі, а становяцца імі пры дапамозе Настаўніка. Спаконвеку былі разумныя фундатары-дабрадзеі, якія ўсяляк спрыялі здольным маладым людзям. У нашай краіне гэтую місію ўзяла на сябе дзяржава.

СТАР. 4

Каму мне дзякаваць за гэту шыр,
За гэту сінь, што растае на сонцы
І потым доўга свеціцца ў душы?
За цішыню — у сна на самым донцы?
За раніцу, што п'ю і не дап'ю,
Зачэрпнуўшы з крыніцы даланёю?
За песню, у якой я пазнаю
Цябе, мая зямля?
Жыццё не мною
Закончыцца...
Што ж, так павінна быць.
Таму яно і вабіць і чаруе,
Таму і нельга ўсё ў ім не любіць,
Што не сябе, а частачку малую
Сваёй любові, радасці сваёй
Здалею перадаць, калі здалею.
І ўсё... Дзяўчо зачэрпне даланёй
Празрысты ранак, вып'е,
і схмялее,
І выгукне насустрач дню: —
Бягу-у!
І сонца сінь растопіць,
пырсне квецень,
Даль адхіснецца, разарве смугу —
Вясна наступіць! Зноў.
У цэлым свеце.
Хай без мяне!
Я знаю, як цвіце
Над галавою неба — белым-белым!
Як набрыняе сонцам нават цень
Чаромхі
над рачулкай разамлелай.
Як дождж ідзе, і ў леташнім лісці
Хаваюцца пралескі, як спявае
Жаўрук — ратаю першаму наўздзіў,
Я знаю. Буду знаць, пакуль жывая!
Хай без мяне, як колісь да мяне,
Вясна прыходзіць, абагнаўшы сненні —
Заўжды ў свой час! — нікога не міне.
Я знаю: ў той далёкае вясне
Паўторацца і гэтыя імгненні.
Каму мне дзякаваць?..



РАЗВІТАННЕ З ТАІСАЙ БОНДАР

ТАІСА МІКАЛАЕЎНА БОНДАР

Беларуская літаратура панесла цяжкую і непапраўную страту. 19 снежня 2005 года памерла вядомая беларуская пісьменніца, член праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне», дырэктар Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» Таіса Бондар.

Таіса Мікалаеўна Бондар нарадзілася ў 1945 годзе ў гарадскім пасёлку Рудзенск Мінскай вобласці. У 1967 годзе скончыла факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Настаўнічала ў г.Фалешты (Малдова). З 1978 года працавала ў тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Была намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь», галоўным рэдактарам часопіса «Всемирная литература». З 2002 года ўзначальвала Рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову «Літаратура і Мастацтва».

Таіса Бондар выступала ў друку з 1970 года. Яе творчы набытак важкі і запатрабаваны часам. Некалькі дзесяткаў кніг паэзіі і прозы. Сярод іх — паэтычныя зборнікі «Захапленне», «...І голас набыла душа», «Святочны снег», «Спадчынны боль».

З сярэдзіны 1980-х выдаюцца кнігі прозы: «Паветраны замак на дваіх», «Спакуса», «Час, калі нас любілі», «Ахвяры», — якія таксама атрымлівалі розгалас далёка за межамі Беларусі.

Сёлета з вялікім поспехам прайшлі прэзентацыі новага літаратурна-мастацкага выдання яе паэмы «Рагнеда».

Увесь працоўны шлях пісьменніцы пазначаны самаадданай дзейнасцю на ніве духоўнасці і роднай літаратуры, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй па абароне высокіх маральных каштоўнасцей і ідэалаў.

Пад удумлівым кіраўніцтвам Таісы Мікалаеўны Бондар Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» забяспечыла стабільны выпуск беларускіх літаратурных перыядычных выданняў.

Светлая памяць пра выдатную беларускую пісьменніцу, прыгожага чалавека і таленавітага кіраўніка назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

У. В. Русакевіч, Л. П. Гуляка, Л. С. Ананіч, М. І. Чаргінец, А. М. Новікаў, А. І. Лемяшонак, У. А. Мачульскі, У. А. Антонаў

Пад такой назвай Таіса Бондар падрыхтавала да друку сваю апошнюю (так ужо даводзіцца пісаць: апошнюю пры жыцці) кнігу філасофскіх разважанняў пра жыццё і спробу зазірнуць за тую мяжу, дзе няма зямнога жыцця, — што там?! Яна гэта ўжо спазнала, яна ўведала тую самую апошнюю таямніцу 19 снежня, ноччу а палове другой... Спазнала, уведала і распачала сваё незямное жыццё, мы ж тут смуткуем, прамаўляем апошнія словы развітання і міжволі задумваемся над сваім такім звыклым зямным жыццём, дзе на сённяшні дзень выпісалася: "З жыцця пайшоў яшчэ адзін вядомы таленавіты беларускі пісьменнік, мужная, мудрая, глыбокая Жанчына, маці свайго адзінага сына Андрэя, нарэшце, кіраўнік літаратурна-выдавецкай установы, якая, дзякуючы Яе намаганням, Яе таленту і жыццёваму вопыту, пачала паднімацца, як кажуць, на ногі"...

ШЛЯХ ДА АПОШНЯЙ ТАЯМНІЦЫ

Тым самым днём 19 снежня мы з пісьменнікам Анатолем Казловым збіраліся пайсці да яе, наведаць у бальніцы, дзе дактары ўжо сказалі свае фатальныя словы, у якія не хацелася верыць: тлела спадзяванне на цуд. Не верылася і ўсім астатнім, хто сябраваў з ёю ці проста ведаў. Вечарам пазваніў даўні сябар Таісы, мастак Уладзімір Тоўсцік: "Нават не ведаю, як запытацца, мо няпраўда?!" І, сапраўды, як паверыць, калі зусім нядаўна ў Палацы дзяцей і юнацтва ладзілася прэзентацыя кніжкі Таісы Бондар "Рагнеда", у такім цудоўным афармленні Тоўсціка, і мы ўтраіх прэзентавалі яе. Паўнюткая зала: шмат вучняў, настаўнікаў, шмат букетаў ужо восеньскіх кветак, нумары мастацкай самадзейнасці юных талентаў у гонар Таісы, а потым аўтографы і аўтографы. Мы радаваліся такому шматлюднаму павароту чытачоў, іхняй цікавасці да нашай літаратуры, перакідваліся жартамі, і Таіса нам з Тоўсцікам раздавала букеты, маўляў, навошта так многа кветак мне адной?! Магчыма, сярод тых кветак Валодзя і запомніць яе, гэта была ці не апошняя іхняя сустрэча?! А калі захоча згадаць першую, трэба будзе перабраць не адзін дзесятак гадоў!

Вось і я хачу згадаць нашу першую з Таісай сустрэчу. І яна згадваецца ў тым самым вестыбюлі нашай цяперашняй установы, дзе мы дзень таму сказалі свае апошнія словы развітання Таісе, а тады, тады...

Дзве маладзенькія паэткі, адна прыехала ў Мінск з Малдовы (дзе жыла на той час Таіса з сям'ёю), другая працавала ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва". Пазнаёміліся — і ўжо праз колькі хвілін адышліся да сцяны і пачалі адна адной чытаць вершы... Мы тады любілі гэта рабіць, шмат сваіх радкоў ведалі на памяць. "Я хачу перабрацца ў Мінск, — сказала напаслед Таіса, — у мяне ж ужо выйшла першая кніжка. Давай, я падпішу табе яе". Гэта быў ці не 1975 год... Неўзабаве, яна і сапраўды перабралася з сям'ёй у Мінск, дзе і пачалася наша сумесная літаратурная маладосць, у якой было шмат сяброў, шмат зычлівых людзей і, вядома ж, былі кнігі... Тася працавала апантана: "Акно ў восень", "Святочны снег", "Спадчынны боль", "Адна"... Я нават адразу і не магу па памяці згадаць іх усе. Потым, як гэта часта бывае, яна пачала пісаць прозу, гэтак жа апантана, як і вершы. Тут таксама пісалася кніга за кнігай, дзе і браўся той час, бо яшчэ ж была праца ў рэдакцыях: кансультант у "Вячэрнім Мінску", потым літсупрацоўнік штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва", пазней — часопіс "Беларусь", дзе яна шмат гадоў працавала намеснікам галоўнага рэдактара, пасля — рэдактар новаўтворанага часопіса "Всемирная литература"... Гэта быў шлях, на якім, што зробіш, гэта ўсё — жыццё, былі і ружы, былі і шыпы. Але шлях быў аддадзены цалкам — Літаратуры.

Жыццё, калі яно на схіле, найчасцей — суровае, бо ўсё больш і больш думаецца пра вечнае і ўсё зямное неяк драбнее. Але, як сказаў мне некалькі гадоў таму Уладзімір Някляеў: "...у нас было цудоўнае юнацтва". Тут мне і хочацца згадаць ягоны верш "Паэтэсы" з кнігі вершаў "Наскрозь" (1985 г.):

Суровы век. Сталёвы скрыгат спрэс.
І ўсё ж не згаслі,
Узышлі прароча
Над лёсам веку
вочы паэтэс —
І вочы Анны, і Марыны вочы.
Пранізваючы цемру аблачын,
Яны гараць на далягляддах сцюжных,
Паэзія — занятак для мужчын.
І для жанчын. Паэзія —
для мужных.

Яна не чалавечы —
божы знак,
Які гартуе душы трапяткія.
Дай Бог так мужна жыць,
Памерці так,
Як мужна памірала Еўдакія.

І калі гром нябёсы скалане,
Глыбінь зямных спасцігну
прыцяжэнне, —
Не свечку вы пастаўце —
Келіх мне,
Каб мог падняць і ў цёмнай старане
Яго за вас,
Таіса, Рая, Жэня...

Жэня, Жэнечка Янішчыц. Яна пайшла ад нас першай. Цяпер у тую старану, можа, нават і не цёмную, правялі Таісу. І мне цяпер па-чалавечы страшна гэтага свайго міжвольнага адзіноцтва. Жанчына ў літаратуры — гэта асобная старонка. Прырода надзяляе яе талентам, і тая ж прырода дае ёй яшчэ адзін дар — магчымасць нараджаць. Паэтка і Маці — гэтыя дзве такія супрацьлеглыя стыхіі. Першая — бунтуе, узрываецца пачуццямі, другая — усё ўціхамірвае, імкнецца да гармоніі, да суладдзя. У свае апошнія дні Таіса Бондар хацела бачыць толькі сына. Відаць, гармонія перамагае.

Да гэтага майго развітальнага слова ў рэдакцыі прасілі фотаздымкі. Я ведаю, што яны ў мяне дзесьці ёсць, але так хутка знайсці не змагла. Ёсць здымак пачатку васьмідзесятых, дзе мы з Таісай ля Дома літаратара прыткнуліся да вялізнага каменя-валуна. Тады была вельмі сонечная раніца, наўкол было шумна, два аўтобусы стаялі недалёка. Пісьменнікі ехалі на Дзень паэзіі ў Віцебск. Як многа такіх літаратурных падарожжаў можна згадаць! Былі ў нас з Таісаю і частыя паездкі па лініі бюро прапаганды мастацкай літаратуры, пэўна, усю Беларусь аб'ехалі. Паўгода ці год паўзгадваць, і можа атрымацца кніга ўспамінаў пра Тасю, пра пісьменніцу Таісу Бондар...

Хацелася мне тут і шмат што працытаваць з Таісіных радкоў, але сярод мноства кніг цяжка знайсці патрэбныя, і ўсё ж адна хутка трапіла на вочы, адгарнула старонку: "Раісе — Раі — Раіньцы з любоўю. Таіса. 25.02.87". Канкрэтна той люты не магу цяпер згадаць, але вельмі добра помню шмат якія дні лютага пад лічбай 20 — Дзень нараджэння Таісы. Яна не дажыла да чарговага два месяцы. Але вось чытаю яе радкі з гэтай кнігі "Спадчынны боль":

Зямля прымае ўсіх,
ёй не патрэбны слёзы:
усё, што позна, — позна,
хай спознішся на міг...

Напэўна, у кожнага, хто ведаў Таісу, хто пражыў з ёю ў літаратуры не адно дзесяцігоддзе, ці хай сабе некалькі гадоў, знойдуцца словы, якія, на вялікі жаль, прамаўляць ужо позна. Любоў вельмі часта спазняецца, як і многія іншыя прыгожыя пачуцці. Таіса добра разумела гэта, умела дараваць і па-свойму любіла ўсіх, з кім даводзілася ёй у гэтым зямным жыцці сутыкацца. Любоў чыталася ў яе вачах падчас нашай апошняй сустрэчы за пяць дзён да Яе шляху ў Вечнасць. Богу — Богава, чалавеку — зямное... Будзем помніць Таісу Бондар такою, якой мы яе ведалі, і гэтую светлую памяць доўжыць...

Раіса БАРАВІКОВА

Новы год ужо на парозе. Можна падводзіць вынікі, складаць планы на будучыню і, канечне ж, загадваць жаданні. Але калі мары давядзецца адкласці да бою курантаў (каб абавязкова спраўдзіліся!), то ўспомніць усё тое прыемнае і светлае, што прынёс год Пеўня, самы час. Дзе мінчане збіраюцца правесці навагоднюю ноч? Што хацелі б убачыць у святочным тэлеэфіры? Магчыма, 2005-ы падараваў некаму незабыўную сустрэчу з цікавым фільмам альбо кнігай. А некага прыемна ўразілі культурныя падзеі, якія адбыліся ў нашай краіне і за яе межамі.

ДОБРУЮ КАЗКУ — У КОЖНЫ ДОМ

Алена, цырульнік:

— Сёлета мне асабліва запомніўся Дзень горада. Шыкоўнае атрымалася свята. Фільм?.. Я прагледзела іх столькі, што ўсіх не пералічыш. З апошняга — "Ілюзія палёту". А ў святочную ноч я б хацела пачуць больш новых песень. Каб можна было патаньчыць ад душы.

Вольга і Насця, студэнткі:

— Чытаем Маркеса, Каэльё, — перабіваючы адна адну, загаманілі дзяўчаты. — У кінатэатр у гэтым годзе мы таксама часта хадзілі. Здаецца, пабывалі на ўсіх прэм'ерах і беларускіх, і замежных стужак.

Сярод культурных падзей асабліва запомнілася дзіцячае "Еўрабачанне". Як мы радаваліся, калі перамагла наша Ксенія!

Святкаваць Новы год збіраемся на цэнтральнай ёлцы з сябрамі. А потым можна і дома адпачыць з сям'ёю. І хочацца абавязкова паглядзець вясёлую камедыю па тэлевізары.

Аляксандр, банкаўскі служачы:

— На жаль, працаваць даводзіцца столькі, што на кнігі амаль не хапае часу. Па тэлебачанні — толькі навіны. Канечне, у будучым годзе хацелася б штосьці змяніць... А ў святы з задавальненнем паглядзеў бы стары фільм. Без розніцы: камедыя ці дэтэктыў. Галоўнае, каб у фінале дабрыня перамагала ўсё дрэннае.

Ніна, настаўніца:

— Мая прафесія абавязвае шмат чытаць. Напрыклад, зараз разам з дзецьмі наноў знаёмлюся з "Падарожжам Нільса". Культурнае жыццё майго класа таксама насычанае. Нядаўна хадзіла ў цырк — там ідзе проста цудоўная праграма! Часта наведваю разам са сваімі вучнямі Тэатр юнага гледача. Новы год планую святкаваць дома, і, канечне ж, буду глядзець тэлевізар па тым канале, дзе прапануюць больш цікавую віншавальную праграму, з вясёлымі песнямі і дасціпнымі жартамі.

Генадзь Іванавіч, пенсіянер:

— Дзе яшчэ можа адзначаць Новы год пажылы чалавек? Дома, у цесным сямейным коле! Добра, каб па тэлебачанні, хоць на час святкаванняў крыху менш увагі адводзілі б палітыцы, дрэнным навінам.

Што тычыцца кніг... З зусім іншага боку мне адкрылася сёлета Біблія. Столькі год нават не браў яе ў рукі, каб проста пагартаць, а ў гэтым раптам пачаў вывучаць, пры тым грунтоўна, без залішняй мітусні.

Для мяне самым яркім уражаннем адыходзячага года стала перамога нашай юнай выканаўцы ў Хаселце. Вось каб і далей так! Бо ў Беларусі, згадзіцеся, таленавітых дзяцей і моладзі дастаткова, каб толькі не змарнаваць гэтыя таленты.

Канечне ж, нельга было не пацікавіцца меркаваннямі падрастаючага пакалення. На маі пытанні адказваюць дзве **Насці, вучаніцы СШ№10:**

— Я шмат кніжак чытаю... — пачала адна.

— І я таксама, — падхапіла другая.

У школе столькі задаюць, асабліва па роднай літаратуры, але нам падабаецца знаёміцца з творчасцю беларускіх класікаў, зазначылі дзяўчынкі. А любімая іх замежная кніжка — Гары Потэр.

Зусім нядаўна яны з захапленнем сачылі за дзіцячым "Еўрабачаннем". І вельмі радаваліся, калі нашы перамаглі! А Новы год абедзве Насці будуць святкаваць дома, з бацькамі. І спадзяюцца, што змогуць паглядзець па тэлевізары маляўнічы канцэрт з удзелам беларускіх і расійскіх зорак.

* * *

Як бачна, год адыходзячы для многіх беларусаў выдаўся неблагім. Ва ўсялякім разе для тых, хто адказваў на мае пытанні. Магчыма, не ўсе жаданні спраўдзіліся. Але наўрад ці з-за гэтага варта сумаваць. Напярэдадзе — цудоўнае свята, калі ўсім, і дарослым, і дзецям, хочацца верыць у казку і ў тое, што мары абавязкова збудуцца.

Святлана САЎКО

ФОТА В. Кавалёва

КРЫЛЫ ДЛЯ КНІЖАК У. ЛІПСКАГА

Напрыканцы лістапада ў Мінскім інстытуце кіравання прайшла сустрэча студэнтаў ВНУ з пісьменнікам Уладзімірам Ліпскім. На імпрэзу таксама былі запрошаны кандыдат філалагічных навук, літаратуразнаўца Маргарыта Яфімава і студэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта Герман Артамонаў, лёс якога цесна пераплецены з лёсам пісьменніка. *Арганізатарам жа мерапрыемства стала дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін, кіраўнік літаратурна-творчага аб'яднання "Натхненне" Зінаіда Варановіч. Вёў вечарыну першы прарэктар МІК Сяргей Спіркоў.*

Уладзімір Сцяпанавіч — не толькі пісьменнік. Ён яшчэ і прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду, член Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка", лаўрэат літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра і Васіля Віткі. Спадар Ліпскі павесяліў прысутных жартаўлівым аповедам аб уласным нараджэнні, расказаў пра свае кніжкі "Жыві сёння", "Бацька", "Я" і падрыхтаваную да друку кнігу "Мы". А таксама падзяліўся трыма складнікамі паспяховага вуснага выступлення, паказаўшы прыклад уласнай прамовай.

Маргарыта Яфімава зазначыла, што Уладзімір Ліпскі піша ў плыні тых праблем, якія хвалююць кожнага: духоўнасць, бацькаўшчына, патрыятызм, дзяцінства. Галоўнае ў творах пісьменніка — любоў да чалавека.

Пачалася вечарына прэзентацыяй электроннай газеты з нагоды выхаду ў свет кнігі Маргарыты Яфімавай пра Уладзіміра Ліпскага "Не выжываю, а жыву", скончылася — невялікім святочным канцэртам з удзелам студэнтаў МІК. *Мерапрыемствы такога кшталту інстытут праводзіць рэгулярна. Гасцямі былі кампазітар Ігар Лучанок, актрыса Святлана Зелянкоўская, сцэнарыст Анатоль Дзялендзік, пісьменніца Таіса Бондар...*

Сёння выпусціць кніжку — мала. Ёй бракуе крылаў. Такія мерапрыемствы Уладзімір Ліпскі ладзіць часта, напрыклад, толькі сёлета ён выступіў больш за 120 разоў. Вечарыны праводзяцца ў бібліятэках, школах, ВНУ. Нядаўна пісьменнік прыехаў з Гомельшчыны. Рыхтуецца да іпрэзаў у Мінску.

Яўгенія МАНЦЭВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ

Фота аўтара

«НА СПАРТЫЎНЫХ АРЭНАХ СВЕТУ»

Гэта другая кніга шматтомніка "Мы — беларусы", якая днямі ўбачыла свет. Фотаальбом з такой назвай трохтысячным тыражом на трох мовах (беларускай, рускай і англійскай) выпусціла нядаўна Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва". У ёй змешчана цікавая інфармацыя аб гісторыі спорту і алімпійскага руху ў Рэспубліцы Беларусь, аб самых знакамітых спартсменах і трэнерах краіны.

Багата ілюстраванае і цікавае па змесце выданне прыйдзецца даспадобы жыхарам рэспублікі.

В. СМАНЦАР

СХОД ЧЛЕНАЎ ЛІТФОНДУ І СБП

У пятніцу, 9 снежня ў ДЛ адбыўся Сход Літфонду. Пасля абмеркавання сітуацыі і кароткіх дэбатаў было вырашана прызнаць працу кіраўніцтва нездавальняючай. Быў абраны новы старшыня праўлення Літфонду. Ім, нечакана для многіх, стаў вядомы літаратуразнаўца Язэп Янушкевіч. Было таксама вырашана выставіць на продаж запушчаны дом творчасці "Іслач", сыходзячы з максімальнага пачатковага кошту ў 800.000 долараў...

Пасля абедзеннага перапынку сход Літфонду адзінадушным галасаваннем быў пераведзены ў рэжым Сходу Саюза беларускіх пісьменнікаў. Згодна пададзеных заяў з СБП па ўласным жаданні выйшлі наступныя літаратары: М. Чаргінец, Г. Марчук, А. Трахімёнак, Р. Баравікова, А. А. Марціновіч, А. Папова, А. Аўруцін, А. Сульянаў, У. Карызна, М. Пазнякоў, Р. Сакалоўскі, В. Паліканіна.

«Пісьменьнік Віктар Карамазаў заклікаў востра не рэагаваць на раскол, ня крыўдзіць сваіх калег "па цэху", а займацца стваральнай працай, творчасьцю і прапагандай беларускай літаратуры», — перадалі ў той жа вечар найбольш аператыўныя СМІ. І гэта было напраўду адно з найлепшых выступленняў. Ды і ўвогуле асаблівых канфрантацыйных прамоў на гэты раз, можна сказаць, не мелася, як, дарэчы, і канструктыўных. Вяласць і апатыя залы падтрымлівалася спарадычным агменем людзей з прэзідыума...

Нарэшце прыйшлі да традыцыйна-выратавальнай высновы: у выпадку экстрэмальнай сітуацыі склікаць пазачарговы з'езд СБП.

На тым і разышліся-раз'ехаліся, «са старым багажом»...

ЛеГАЛ

Наступны нумар газеты "Літаратура і мастацтва" выйдзе 6 студзеня.

Наталля АЎДЗЕЕВА:

«ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ — КЛОПАТ ДЗЯРЖАЎНЫ»

Падзея, якая ва ўсіх на вуснах: маленькая грамадзянка Беларусі Ксенія Сітнік стала першай на папулярным конкурсе "Еўрабачанне-2005". Дарэчы, яшчэ пасля перамогі на Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка", які праходзіў у Магілёўскай вобласці, гэтая зорачка з Мазыра стала стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Сапраўды, таленты-самароднкі не ўзнікаюць на "зорным небасхіле" ніадкуль. Дзеці не нараджаюцца мастакамі ці музыкантамі, а становяцца імі пры дапамозе Настаўніка. Спаконвеку былі разумныя фундатары-дабрадзеі, якія ўсяляк спрыялі здольным маладым людзям. У нашай краіне гэтую місію ўзяла на сябе дзяржава.

«Майстры і вучні»

На Беларусі з паняццем школа звязваюць звычайна акадэмічную традыцыю. Аднак традыцыя — гэта не толькі перадача тэхнічных навыкаў і пэўных прыёмаў. Шматлікія настаўнікі або майстры працуюць, шукаюць сябе ў розных накірунках. Для саміх жа майстроў, а сярод іх шмат і маладых, самавызначэнне іншым разам таксама немагчыма без непасрэднай дапамогі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі: нездарма ж адна са шматлікіх выстаў стыпендыятаў мела назву "Майстры і вучні"!

Вось ужо дзесяць гадоў гэта унікальная арганізацыя пад непасрэдным патранажам Кіраўніка дзяржавы садзейнічае станаўленню і развіццю будучай творчай эліты беларускай нацыі. Каб уявіць маштабы, звернемся да статыстыкі. За час існавання фонду фінансава падтрыманы амаль дзве тысячы чалавек, палова з якіх сталі яго стыпендыятамі. Заахвочвальныя прэміі атрымалі 154 выпускнікі навучальных устаноў, 20 прысуджаны прадстаўнікам студэнцкай і навучэнцкай моладзі. Больш як паўтысячы аказана матэрыяльная дапамога. Прысуджаны дзве імянныя прэміі, два Гран-пры, 194 гранты. Ды яшчэ 28 Гранд-прэмій — вышэйшых узнагарод — з прысваеннем званняў лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

А ўзначальвае савет фонду намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе **Наталля Аўдзеева**. Дарэчы, не толькі дзяржаўны дзеяч — лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу вакалістаў, аўтар шматлікіх сцэнарыяў і рэжысёр Міжнароднага лялечнага фестывалю "Лялька".

— Наталля Пятроўна, якімі прынцыпамі кіруецца фонд у сваёй рабоце? Хто ўваходзіць у савет?

— Перш за ўсё, забеспячэнне роўных магчымасцей для развіцця творчых здольнасцей юных грамадзян Беларусі незалежна ад месца іх жыхарства і сацыяльнага становішча. Яшчэ — аказанне адраснай падтрымкі канкрэтным прадстаўнікам таленавітай моладзі, творчым калектывам, установам культуры і мастацтва. Аб'ектыўнасць разгляду ўсіх паступаючых прапаноў. Дэмакратызм, даступнасць для любога таленавітага чалавека. Ну а наш савет — гэта прадстаўнікі дзяржаўных органаў кіравання, спецыялісты і прафесіяналы ў сферы культуры і мастацтва. Словам, людзі дасведчаныя. А мэта ў нас адна — зрабіць усё, каб сапраўды таленавітыя дзеці былі заўважаны, падтрыманы і пазней мелі магчымасць быць запатрабаванымі ў нашай Беларусі.

Дарэчы, два мінулыя гады былі важным этапам у гісторыі арганізацыі. Для ўдасканалення дзейнасці Ўказам Кіраўніка дзяржавы была зацверджана новая рэдакцыя Палажэння аб Спецыяльным фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, унесены грунтоўныя дапаўненні ў Палажэнне аб заахвочванні таленавітых навучэнцаў. Гэта і ёсць асноўныя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць сёння нашу дзейнасць.

— І якія яны ўнеслі карэктывы?

— Павялічылася колькасць відаў заахвочванняў: у прыватнасці, за высокія дасягненні ў сферы культуры і мастацтва стала прысуджацца Гранд-прэмія і званне лаўрэата спецыяльнага фонду. Пашырылася кола ўзнагароджаных ва ўзросце да 31 года. Зацверджана ў новай рэдакцыі Палажэнне аб заахвочванні таленавітых навучэнцаў, студэнтаў, педагогаў, маладых дзеячаў культуры і мастацтва: стыпендыі фонду пачалі выплачвацца неаднаразова, а на працягу каляндарнага года.

Дапамога? Адрасная!

— Якія праекты, культурныя акцыі займелі фінансавую падтрымку фонду?

— Галоўным чынам тыя, што ўжо зарэкамендавалі сябе і сталі традыцыйнымі: да прыкладу, міжнародны дзіцячы конкурс "Музыка надзеі", рэспубліканскі конкурс навучэнцаў дзіцячых мастацкіх школ, аддзяленняў школ мастацтваў, агульнаадукацыйных школ з мастацкім і архітэктурна-мастацкім ухілам, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў мастацтваў, а таксама шэраг іншых.

— А як наконт аказання адраснай дапамогі?

— Як і запатрабаваў Кіраўнік дзяржавы, за апошнія два гады яе стала прыкметна больш. Заахвочванні атрымалі таленавітыя маладыя людзі, якія дасягнулі значных вынікаў на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Гэта віртуозныя музыканты Аляксандр Шувалаў, Арцём Шышкоў, Канстанцін Красніцкі, Павел Нетук. Пераможцы і прызёры міжнародных конкурсаў Анастасія Кашчышына, Вольга Сацюк, Пётр Ялфімаў, Паліна Смолава, Кацярына Ліпоўская, Ксенія Сітнік і многія-многія іншыя.

Акрамя таго, аказваем адрасную фінансавую падтрымку творчым калектывам, установам культуры, мастацтва і адукацыі для набыцця музычных інструментаў, абсталявання, матэрыялаў для заняткаў мастацка-выяўленчай творчасцю, арганізацыі шматлікіх культурных акцый, разнастайных творчых школ, нават стажыровак таленавітай моладзі за межамі краіны і інш. Выдзелены цэлы шэраг грантаў.

Сродкі накіроўваюцца таксама для заахвочвання прызёраў новых конкурсаў і фестываляў па розных жанрах мастацтва, для правядзення разнастайных творчых школ. За кошт фонду штогод выпускаюцца кампакт-дыскі з запісамі выступленняў ягоных стыпендыятаў і лаўрэатаў, выдаюцца мастацкія каталогі і інфармацыйныя бюлетэні.

Пры фінансавай падтрымцы фонду беларускія юнакі і дзяўчаты вельмі паспяхова паўдзельнічалі ў маладзёжных Дэльфійскіх гульнях у Германіі. У Дзюсельдорфе немцы слухалі творы Вагнера стоячы. Як найвышэйшая адзнака, прагучалі словы аднаго з іх: "Калі ў краіне ёсць такія дзеці, яна не можа не быць вялікай".

Дарэчы, летась нашы музыкі дастойна прадстаўлялі Беларусь на маладзёжных Дэльфійскіх гульнях краін-удзельніц СНД у Малдове, дзе атрымалі 12 медалёў, пяць з якіх — залатыя.

Аб'ектыўнасць. Празрыстасць.

— Наталля Пятроўна, хацелася б ведаць, наколькі плённа працуе кіраўніцтва фонду з рэгіёнамі?

— Для пошуку юных талентаў, эфектыўнай ацэнкі іх дасягненняў, аказання прафесійных кансультацый члены экспертна-мастацкай камісіі фонду выязджаюць на месцы. Магу заверыць: гэта, як правіла, высокакваліфікаваныя і аўтарытэтныя спецыялісты па розных відах і жанрах мастацтва. Вельмі важным шанцам для выяўлення творчых талентаў у рэгіёнах з'яўляюцца штогадовыя справаздачныя канцэрты і мастацкія выставы стыпендыятаў і кандыдатаў у стыпендыяты спецыяльнага фонду

— А з замежжам? Дарэчы, ці ёсць увогуле аналагічныя структуры на постсавецкай прасторы?

— Мы актыўна спрабуем наладзіць кантакты з калегамі! У нас, падкрэсліваю, адзіны ў свеце фонд, які існуе непасрэдна пад патранажам Кіраўніка дзяржавы. Адсюль і высокі ўзровень работы, прафесіяналізм, аб'ектыўнасць, празрыстасць, адказнасць. Інакш — нельга. Ну, а дабрачынныя фонды залежаць ад фундатараў.

— З кім сябруеце?

— Да прыкладу, у Расіі створаны міжрэгіянальны дабрачынны фонд "Новые имена", якім кіруе заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі Івета Мікалаеўна Воранава. У Мінску пабывала дэлегацыя, у складзе якой прыехалі выдатныя педагогі: народныя артысты Расіі, прафесар І. Бычкова і прафесар А. Скаўронскі, заслужаны артыст Расіі А. Селязнёў і дырэктар творчых школ фонду "Новые имена" У. Маеўскі. І стыпендыяты — навучэнцы школы імя Гнесіных, Цэнтральнай музычнай школы пры Маскоўскай кансерваторыі імя П. Чайкоўскага і Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага вучылішча пры кансерваторыі Э. Міраслаўскі, К. Шышкіна, М. Мерынг, В. Лапаціна, В. Кірпічова, А. Чубарын. А сярод нашых стыпендыятаў былі прадстаўнікі, якія прадэманстравалі магчымасці навучальных устаноў не толькі сталіцы, але і рэгіёнаў. Гэта Аня Мажорава з Магілёва, Уладзімір Плігаўка з Наваполацка. Так што айчынная сістэма адукацыі дазваляе ўсім дзецям нашай краіны развіваць свой талент — незалежна ад месца жыхарства.

Акцыя гэта лагічна ўпісалася ў Год культуры Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Да таго ж, яна была прымеркавана да святкавання 60-годдзя Вялікай Перамогі.

А нядаўна больш чым 90 беларускіх таленавітых юнакоў і дзяўчат бралі ўдзел у II Міжнародным фестывалі краін СНД і Балтыі "Масква сустракае сяброў", які праходзіў пад патранажам У. Співакова. Гэта была самая прадстаўнічая дэлегацыя. Музыкант з Мінска Іван Карызна так спадабаўся маскоўскай публіцы, што яму пасля канцэрта "Виртуозы Москвы" падарылі вельмі дарагую віяланчэль.

У чэрвені адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з былымі стыпендыятамі фонду па падтрымцы таленавітай моладзі і фонду сацыяльнай падтрымкі адораных студэнтаў і навучэнцаў, каб вызначыць эфектыўнасць працы гэтых арганізацый і перспектывы іх дзейнасці. Па выніках сустрэчы Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь і іншым зацікаўленым структурам даручана распрацаваць Дзяржаўную праграму "Таленты Беларусі" і абнавіць электронныя банкі дадзеных фондаў, дзе сканцэнтравана ўся інфармацыя пра стыпендыятаў. Бо кожны з іх — сапраўднае багацце нашай краіны, найвялікшая каштоўнасць, бясцэнны дыямент беларускай навукі і культуры.

І надзейныя партнёры...

— Дзе маюць магчымасць выступаць вашы стыпендыяты?

— Думаю, многія заўважылі: ужо стала традыцыяй, што самыя лепшыя залы і сцэны ў сталіцы і рэгіёнах аддаюць дзецям падчас справаздачных канцэртаў, мастацкіх выстаў. Гэта Вялікі акадэмічны тэатр оперы і балета, Палац Рэспублікі, Белдзяржфілармонія. Менавіта тут, у яе зале, пасля рэканструкцыі праходзіла адкрыццё Міжнароднага фестывалю музыкі "Мінская вясна-2005". Атрымаўся цудоўны сумесны канцэрт стыпендыятаў беларускага фонду і расійскага Міжрэгіянальнага дабрачыннага грамадскага фонду "Новые имена". Дарэчы, падчас такіх сустрэч з юнымі і дарослымі суседзямі-аднадумцамі важна, лічу, не толькі і не столькі творчае спаборніцтва, колькі сяброўства.

— Што цікавага ў планах?

— Стварэнне сумеснага юнацкага сімфанічнага аркестра падчас летняга адпачынку, рэпетыцыі і гастролі на прасторах Расіі і Беларусі. І гэта ўжо не толькі мары... Маем намер наладзіць выпуск сумесных кампакт-дыскаў.

Будзем пашыраць культурнае супрацоўніцтва з краінамі СНД. Прадоўжым творчыя стасункі з узгаданымі расійскімі фондамі. Лічу гэта вельмі важным. Бо гаворка ідзе аб прапагандзе нацыянальнай беларускай культуры за межамі нашай краіны.

— А ў нашай краіне хто з'яўляецца вашым надзейным партнёрам?

— Савет фонду актыўна і эфектыўна супрацоўнічае з Адміністрацыяй Прэзідэнта і Урадам, з міністэрствамі культуры і адукацыі, з падведамнымі ім структурамі і ўстановамі.

Асаблівую ж удзячнасць за падтрымку, разуменне і супрацоўніцтва хочацца выказаць Міністэрству культуры і Беларускаму дзяржаўнаму інстытуту праблем культуры, дзе створаны Цэнтр па рабоце з таленавітай моладдзю. Гэта — каардынатар шматлікіх мерапрыемстваў, у тым ліку і тых, што праводзяцца па лініі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Галіна СУША,
старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

Фота забяспечана аўтарамі



Сёння ніхто ўжо не сумняваецца ў тым, што прайшоўшы нядаўна ўстаноўчы сход новай грамадскай арганізацыі — Саюза пісьменнікаў Беларусі — стаў знакавай падзеяй для ўсёй інтэлігенцыі нашай краіны. Думкі і меркаванні, якія прагучалі з трыбуны сходу, актыўна і досыць горача абмяркоўваюцца не толькі ў літаратурных колах. Ну а што да ўласна творцаў, дык тут, што называецца, сам Бог загадаў! Узгадаем славутае "З кім вы, майстры культуры?" Вось і зараз сітуацыя "пытае": а вы з кім, майстры літаратуры?
Упэўнена, што гэтае пытанне — у тым ці іншым варыянце — кожны, перш за ўсё, задае сабе самому. І робіць выбар. Такі, які сумленне падказвае. А яшчэ — клопат пра лёс айчыннай літаратуры.
І, зразумела, самой Айчыны ўвогуле.
Сёння наш суразмоўца — Генадзь ПАШКОЎ, вядомы беларускі паэт, публіцыст. Галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". За амаль дзесятак гадоў, на працягу якіх Генадзь Пятровіч узначальвае гэтую вядомую ўстанову, з яе "сцен" выйшлі да шырокага чытача такія фундаментальныя кнігі, як васемнаццацітомная універсальная "Беларуская энцыклапедыя", шасцітомная — у сямі кнігах — "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі", грунтоўныя энцыклапедычныя даведнікі "Рэспубліка Беларусь: вобласці і раёны", "Асветнікі зямлі Беларускай", "Сусветная культура" і багата іншай літаратуры, здольнай істотна ўзбагаціць духоўнасць нашага народа і дзяржавы.

Генадзь ПАШКОЎ

МЫ НЕ ПОЙДЗЕМ У ФАРВАТЭРЫ «ПЭН-КЛУБА»

Працэс — заканамерны

— Як вы, Генадзь Пятровіч, лічыце: ці так ужо наспела стварэнне новай творчай пісьменніцкай суполкі? Думкі літаратараў наконт гэтага, зыходзячы з выступленняў у прэсе афіцыйнай і апазіцыйнай, падчас дыяметральна супрацьлеглыя!

— Асабіста я ўпэўнены: тое, што здарылася, павінна было здарыцца. І магло адбыцца значна раней, гадоў больш як дзесяць таму. Размежаванне ў нашым асяродку, мне здаецца, пачалося яшчэ тады, калі на хвалі новых сацыяльна- палітычных абставін некаторыя калегі, асабліва з былых партактыўцаў, пачалі здзіўляць увішнай светапогляднай пераліцоўкай. З ранейшым партыйным імпэтам, з якім яны ўзвышалі трыбунным і паэтычным словам "адзіную і накіроўваючую", а заадно і заўзята кіравалі літаратурным працэсам ад яе імя — ды так, што нават Максіма Танка ды Івана Шамякіна павучалі, як жыць і працаваць — яны раптам пачалі "вучыць і накіроўваць" у адваротным напрамку. Асабліва пасля пераломнага 1991 года.

Тое напорыстае пераліцаванне мяне проста ашаламляла. Можа, таму, што ў самы кіпучы час перабудовы быў я ў Саюзе пісьменнікаў сакратаром парткама. Пасля працаваў у ЦК. І, паверце, шмат чаго панаслухаўся і паначытаўся ў арыгінале, пра што многія з маіх паплечнікаў і не ведалі.

І вось — новая жыццёвая акалічнасць, і ранейшыя "рыцары партыі" з розных сфер у іншых даспехах ідуць у наступ. Якраз тады і напісаў:

Халуі ўчарашнія цэкоўскія
Сёння ў дэмакратаў халуі.
Вы даносы іх чыталі плоскія?
На падхопе ўвішныя былі!
Падалі у гразь перад патронамі
і, лакеі хіжыя ў душы,
нас вучылі словамі калёнымі.
Паспрабуй — насуперак скажы!
Спешчаныя ўладаю нахабнікі
парыванняў цэлілі палёт
да дзвярэй
прамхарчразмеркавальнікаў,
дбаючы на словах пра народ.
Хіжыя, яны не адракліся
браць жыцця лацвейшыя дары.
Прагна дбаюць аб уласнай місе
і на новых ветрах — "змагары".
Ды не ўсё купляецца.
У лёсе кожны атрымае за паі:
халуі, яны ў любой эпосе
і былі, і будуць халуі!

Па праўдзе кажучы, сёння мне пра ўсё гэта непрыемна згадваць, тым больш, што гаворка ідзе пра вельмі вузкае кола людзей, якія проста загуляліся ў палітыку і ніяк не могуць пазбавіцца ачмурэння. Урэшце, кожны мае права мець сваю жыццёвую пазіцыю. Аднак сілком навязваць уласныя погляды іншым або, што яшчэ горш, выступаць ад імя іншых, у дэмакратычным грамадстве непрымальна.

Каму пытанні вырашаць?

— Што вы маеце на ўвазе?

— Ці ж адзін раз нам даводзілася адмяжоўвацца, у тым ліку ў прэсе, на тэлебачанні і радыё, ад мітынговых дэмзаяў-скараспелак нашых творчых кіраўнікоў? Здзіўляла, з якой лёгкасцю пачалі прымаць некаторых літаратараў у Саюз беларускіх пісьменнікаў — часам па зусім незразумелых прычынах. Для чаго? Можа, каб заручыцца прыхільнікамі і на чарговых выбарах актыўна выкрэсліваць з бюлетэняў для тайнага галасавання тых, хто не за іх "дэмакратыю"? Ці ж гэта нармальна, калі на пісьменніцкім з'ездзе шчыравалі выкрэсліваць са спісаў мяркуемых членаў праўлення выдатнага пісьменніка, франтавіка, які з юнацкіх гадоў быў партызанам і дайшоў да Берліна?

А які дэмакратызм праяўляўся пры галасаванні за вылучэнне кандыдатаў на атрыманне Дзяржаўных прэмій ці ў іншых абставінах? Пачытайце хоць бы дзённікавыя запісы Івана Шамякіна, што надрукаваў часопіс "Полымя" ў адзінаццатым нумары за гэты год.

І ўрэшце, чаму зацятая пазіцыя некалькіх дзесяткаў чалавек павінна складаць уражанне апазіцыйнасці сацень пісьменнікаў? Зыходзячы з народнай прымаўкі: "У гурце і бацьку лацвей біць"?..

Дадам, што ўсё гэта рабілася на фоне недаравальнай безгаспадарчасці, калі даводзілася да стану разбуранай Пампеі наша неацэнная маёмасць — Дом творчасці "Іслач".

Карацей, пытанняў наспела дужа багата. Ды вось бяда — няма каму задаць іх, а вырашаць — тым больш. Шмат хто разумеў бязвыхаднасць становішча, і наспела адэкватнае рашэнне.

— Даводзілася чуць і такое меркаванне: можа, дастаткова было правесці перавыбары кіраўнічых органаў у дзеючым пісьменніцкім Саюзе?..

— Дык гэта ўжо было! На апошнім з'ездзе мы з надзеяй падтрымалі кандыдатуру маладога і таленавітага Алеся Пашкевіча. Асабіста я бліжэй з ім пазнаёміўся падчас сустрэчы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў у Ялце. Памятаю, якое добрае ўражанне склалася пра яго ў выдатнага рускага паэта Ягора Ісаева, празаіка Валерыя Ганічава.

Увогуле былі вялікія спадзяванні, што наша творчая суполка страсе з сябе ўсё наноснае, усё, што творчасці зусім неўласціва. Але маладога імпэту і вопыту Алеся, тут, як мне здаецца, не хапіла. Дый хто б яму дазволіў павесці ў іншым накірунку?

Каб сустракацца з чытачамі

— Зыходзячы з нашай размовы, нават не пытаюся, за які саюз — дзеючы ці новы — "галасуеце" асабіста вы. Але хацелася б ведаць стаўленне Генадзя Пашкова да размоў пра магчымы раскол у пісьменніцкім асяродку ў сувязі са стварэннем новай суполкі.

— Я добра ведаю, што пасля ўстаноўчага сходу па стварэнні Саюза пісьменнікаў Беларусі са старонак розных газет ды з эфіру замежных "галасоў" загучалі незадаволеныя выпады. Акрамя зацятай злосці, аргументаў, лічу, аніякіх! Зноў — пытанне: чаму ж вы не абураліся, калі ўтвараўся так званы "Апрель"? Нават прапанова назваць мяркуемае аб'яднанне "Красавіком" была рэзка абарваная.

Чаму ж вы, панове, маўчалі, калі ствараўся "ПЭН-клуб", а пасля і самі туды паўваходзілі?.. Не, мы не пойдзем у фарватэры "ПЭН-клуба".

СПБ павінен стварыць у сваім асяродку такую атмасферу, каб панаваў творчы дух, каб на першым плане былі творчыя інтарэсы пісьменніка. Каб меў ён магчымасць сустракацца з чытачамі, будучымі героямі сваіх твораў. Каб не ляжалі ў выдавецтве дзесяцігоддзямі ягоныя рукапісы, а ў той самы час бібліятэкі мелі даволі мізэрны фонд беларускай літаратуры.

А ўзяць нашых патрыярхаў — пісьменнікаў-франтавікоў. Яны ж аказаліся, па сутнасці, пакінутымі сам-насам. Ці ж гэта нармальна? Адыходзяць заслужаныя людзі, а мы часам пра гэта і не ведаем.

— Дарэчы, пра заслугі... Тыя з літаратараў, якія выказваюць незадавальненне з нагоды стварэння СПБ, прыводзяць яшчэ адзін аргумент: маўляў, ні кніжак у яго прыхільнікаў, ні гучнасці імёнаў...

— Няма імёнаў?.. Цікава, што за імянітыя аб'явіліся? Яны што, з дваццацігадовай даўніны пазвальваліся? Ці, можа, дванаццаць лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі ў галіне літаратуры ды ўладальнікі іншых аўтарытэтных узнагарод, а таксама літаратары, ушанаваныя званнямі заслужанага дзеяча культуры, акадэміка — гэта не імёны? Глупства суцэльнае!

Сёння выразна бачна адно: нашаму імкненню працаваць стваральна, рабіць усё, наколькі мы здатныя, каб у Беларусі панавалі мір і спакой, ніхто не ў стане перашкодзіць. Як бы ні стараўся...

Гутарыла Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Фота К. ДРОБАВА

Нягледзячы на шырокую амплітуду тэматыкі твораў сучаснага прыгожага пісьменства, усё часцей цэнтруючымі праблемамі сюжэтаў выступаюць пытанні не менш як глабальнага характару...

СЮЖЭТЫ – ЛАКАЛЬНЫЯ, СЭНСЫ – ГЛАБАЛЬНЫЯ...

«Полымя» № 11

Вершы Казіміра Камейшы дэманструюць, што да спасціжэння існасці і логікі чалавечых узаемаадносін паэт імкнецца праз асэнсаванне асабіста перажытага. Усведамленне складанай дыялектыкі жыцця ўвасабляецца ў рытарычным пытанні:

Што паміж памяццю і снамі, —
Я добра ведаю даўно.
Не разумею я адно:
Што, людзі, дзеецца між намі?

Вячаслаў Дашкевіч з патрыятычнай апантанасцю *размахвае* "Сцягам", пераконваючы суайчыннікаў:

Мы не статак. Мы — народ.
Прэч, драты ахоўныя!
І на захад, і на ўсход
Мы глядзім як роўныя.

У кантэксце папярэдняга верша радкі Змітрака Марозава ўспрымаюцца як перасцярога, каб ліхаманкавае імкненне да свабоды не зацьміла іншых каштоўнасцей...

У пошуку ўяўнай свабоды,
Багацця і славы пустой
Як шмат нарабілі мы шкоды
Адвечнай прыродзе жывой.

У рамане Таісы Бондар "Гульня ў падкіднога" ўзнаўляюцца падзеі 90-х гадоў XX стагоддзя. Тут паралельна развіваюцца дзве сюжэтныя лініі: першая — палітычныя пературбацыі ў краіне, другая — лакальнае жыццё тэатральнага калектыву. Аўтар дэманструе, як палітычныя сцэнарыі экстрапалююцца ў сферу культурнага жыцця, уплываюць на духоўны свет асобы. "Жыццё — тэатр, і ўсе ў ім — скамарохі... <...> Вось толькі тэатры розныя здаўна існавалі: драматычныя, музычныя, сатырычныя, эксперыментальныя... Страшна, калі ўсе яны раптам — па патрабаванні адпаведна настроенай публікі — ператвараюцца ў тэатры марыянетак..." Сюжэт твора напоўнены шматлікімі сэнсамі: аўтар вядзе рэй пра ўмовы творчасці, пра ўнутраную свабоду мастака і спосабы творчай рэалізацыі. Многія эпізоды, фразы, рэплікі герояў-акцёраў у тэксце твора гучаць падкрэслена палемічна (накшталт: "Сэнс жыцця залежыць не ад таго, ш т о, а ад таго, х т о яго вызначае"), тым самым прыцягваючы чытача да асабістага асэнсавання ўзнятых пытанняў.

Стагоддзю Яна Скрыгана прысвечаны матэрыялы рубрыкі "Спадчына". Увазе чытачоў прапануецца нізка навел, якія друкуюцца ўпершыню. У артыкуле "Пераадоленне наканаванага" Людміла Карпава расказвае пра лёс пісьменніка, духоўныя і эстэтычныя чыннікі яго творчасці.

З дзённікавымі запісамі Івана Шамякіна, якія датуюцца 1997—1998 гадамі, можна пазнаёміцца ў рубрыцы "Старонкі лёсу". Гэтыя запісы цікавыя не толькі непасрэднай інфарматыўнасцю, але і змястоўнымі ацэнкамі і каментарыямі пісьменніка ў дачыненні грамадскіх з'яў, сацыяльных працэсаў, вядомых дзеячаў краіны.

Рубрыка "Школьны факультатыў" прысвечана творчасці Раісы Баравіковай. Тут друкуюцца паэтычныя творы аўтара і асобныя сцэны з гістарычнай драмы "Барбара Радзівіл". У артыкуле "А на душы і светла, і шчымліва..." Вячаслава Смаля можна пазнаёміцца з біяграфіяй і этапамі творчага росту Р. Баравіковай.

Матэрыял Зіновія Прыгодзіча "Тры сустрэчы з Міхасём Савіцкім" — гэта своеасаблівая экскурсія ў творчую лабараторыю славутага беларускага майстра жывапісу.

Праблемы глабальнага пацяплення, агульных зменаў клімату сёння непакояць усё чалавецтва. У артыкуле "Хто робіць надвор'е?" на актуальныя пытанні адказвае дырэктар Інстытута праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі НАН Беларусі Уладзімір Логінаў.

«Маладосць» № 11

Аматарам эмацыянальнай паэзіі прыйдуцца па густу вершы Наталлі Дзівінай, аб'яднаныя назвай "Больш не давяраю парасонам", наскрозь працятыя болем і пакутай ад няспраўджанага кахання. Не менш эмацыянальнымі падаюцца і апавяданні Міколы Бусько. Тут, праўда, наадварот пераважаюць эмоцыі пазітыўнага характару — ад прыгажосці і гармоніі прыроды.

Прыхільнікаў неверагодных дзівосаў і прыгодаў задаволіць, несумненна, чарговы выпуск "Фантаста", які друкуецца ў лістападаўскім нумары "Маладосці". Пераважная большасць фантастычных узораў пераконвае, што нават праз стагоддзі, у будучыні, прырода насельнікаў Сусвету застанецца нязменнай — усё яны варагуюць, ваююць, высвятляюць адносіны і штосьці дзеляць... Гэта відавочна і з апавядання Сяргея Лукашанца "Карабель набліжаецца", і з апавядання Алеся Бычкоўскага "Муары Лідлу". У апошнім, напрыклад, героі твора, кіруючыся меркантыльнымі інтарэсамі, наведваюць таямнічую "заснежаную" планету і назаўжды робяцца яе палоннікамі...

Аматарам касмічных фэнтэзі адрасуюцца "Зорныя гульні" (з элементамі аркады і квэста) Сержа Мінскевіча.

Аповесць Раісы Баравіковай "Лён-Лянок, альбо Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка" адрасавана аўдыторыі падлеткаў. Касмічныя вандроўкі і непрадказальныя перыпетыі, што адбываюцца з героямі, пазначаны ментальна-беларускімі геаграфічнымі вехамі, якія паступова распаўсюджваюцца і ўкараняюцца ў Сусвеце — планета Гусляр (у спрадвечных насельнікаў — Пурнас), астэроід Дранік і інш. Адметна, што ў сюжэце твора мажліва не толькі атрымаць вострае ўражанне ад падарожжа на зоркалёце ці ад тэлепартацыі, але выпадае пазнаёміцца нават з такой "рарытэтнай" справай як традыцыйны для беларусаў выраб ільняной тканіны...

Прыхільнікам фантастыкі будзе карысна пазнаёміцца з артыкулам Андрэя Паўліхіна "Фата-маргана на мяжы тысячагоддзяў". Аўтар аналізуе і робіць своеасаблівае падсумаванне ўзораў беларускай фантастыкі на старонках літаратурных выданняў.

Рубрыка "Партрэты нашых ВНУ" распачынаецца гутаркай Таццяны Дрык і Марыны Цярэшчанкі з рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ядвігай Грыгаровіч. З артыкула Ірыны Занеўскай "Жыве alma-mater, святыня і гонар..." мажліва даведацца пра гісторыю і асноўныя накірункі дзейнасці славутай навучальнай установы. Матэрыял "Аб'яднала родная спадчына" — гэта гутарка Ірыны Клімковіч з кіраўніком ансамбля "Грамніцы" Уладзімірам Зяневічам, прафесарам кафедры народна-песеннай творчасці універсітэта. Пытанні літаратурнай творчасці Янка Лайкоў абмеркаваў з паэтэсай, кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры беларускай філалогіі БДУ культуры і мастацтваў, кіраўніком універсітэцкага літаб'яднання "БУКет" Аленай Багамолавай. Нельга абмінуць увагай і стороначку гэтай рубрыкі пад назвай "Тут жывуць музы", дзе былыя навучэнцы, а сёння — вядомыя дзеячы краіны згадваюць сваё студэнцтва. Сярод іх — Андрэй Федарэнка, Ірына Дарафеева, Алег Елісеенкаў, Вікторыя Алешка і Янка Лайкоў.

75-годдзю Уладзіміра Караткевіча прысвечана публікацыя вершаў майстра айчыннага прыгожага пісьменства. Аляксей Ненадавец аналізуе светапогляд пісьменніка ў артыкуле "Міфалогія ў творах Уладзіміра Караткевіча".

«Нёман» № 11

У апавяданні Івана Пташнікава "Осколок звезды" (пераклад з белар. Міхаіла Пазнякова) падзеі разгортваюцца ў мірны час, праз дзесяцігоддзі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Толькі памяць усё не адпускае галоўнага героя, моцна трымае яго ў сваіх абцугах. Святкаванне ўгодкаў Вялікай Перамогі абвастрае ўспаміны, непакоіць і вымушае наведаць мясціны баявога мінулага. Іржавая міна, якая засталася ў зямлі з вайны, нібыта чакала сваёй апошняй ахвяры...

У рамане Ганада Чарказяна "Не умирай раньше смерти" падзеі датычацца гэтаксама вайны, але зусім іншага кшталту — братазабойчай, якая лютуе паміж каўказскімі народамі. Сюжэт твора дэманструе мноства складаных фактараў, якія сышліся ў адзінстве на гэтай вайне. Тут перапляліся і фанатычныя вераванні, і тэрытарыяльныя падзелы, і асабістыя крыўды і варагаванні. Усе гэтыя фактары некаторыя *вушлыя* дзеячы ўмела скарыстоўваюць дзеля рэалізацыі ўласных амбіцый і вырашэння праблем прыватнага кшталту. Галоўны герой аказваецца ўцягнутым у жудасныя перыпетыі нібыта выпадкова, праз авантурную любоўную інтрыжку. Яго існаванне падзяляецца на два своеасаблівыя вымярэнні... Нядаўняе ўнармаванае і спакойнае жыццё ў Маскве, дзе быў наладжаны невялікі бізнес і нармальны быт, а самай вялікай непрыемнасцю рабіліся рэгулярныя праверкі дакументаў на вуліцах сталіцы па прычыне прыналежнасці да "каўказскай нацыянальнасці", рухнула ў адно імгненне. Самалёт рэйса "Масква — Баку" нібыта пераносіць героя ў іншы свет, дзе пануюць дагэтуль невядомыя яму законы. Новыя рэаліі — суіснаванне ў камеры з сабе падобнымі, змучанымі і спустошанымі людзьмі, заложнікамі, жывым таварам — падаюцца яму кашмарам...

У рубрыцы "Впервые в "Нёмане" друкуюцца вершы Янкі Лайкова (пераклад з белар. Андрэя Цяўлоўскага) і Вадзіма Маркава. Творы абодвух паэтаў паяднаны ўрачыстасцю інтанацый, пэўным падабенствам вобразаў і відавочнай ідэнтычнасцю творчага крэда. Так, Янка Лайкоў пераконвае:

Пусть рок мой полон бурь и гроз...
Душа покоя не захочет,
И я своих не вижу слёз —
Поэзия мне застит очи.

Вадзім Маркаў рэхам адгукаецца калегу па цэху:

Жизнь и поэзия едины
Как ипостаси Красоты,
Два имени одной вершины
Два берега одной мечты...

У аўтабіяграфічных апавяданнях Віктара Дайліды (пераклад з белар. Дарыны Шабаліной) зафіксаваны жыццёвыя назіранні аўтара, неардынарныя эпізоды чалавечага быцця.

У рубрыцы "Публіцыстыка" працягваецца друкаванне нарыса Аляксандра Казінцава "Киев сдали. На очереди Москва?" Аўтар разважае пра сучаснае палітычнае становішча на постсавецкай прасторы.

Гераіня нарыса Ганны Александровіч "Встань... И иди!" — Ірына Фядотава — залаты прызёр Параалімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, неаднаразовая пераможца буйнейшых міжнародных спаборніцтваў. Але галоўнае дасягненне Ірыны Фядотавай — гэта нязломнасць перад уласным лёсам і абставінамі...

У рубрыцы "Служим Отчизне" друкуецца артыкул Яўгена Каршукова "В лесу прифронтовом". Аўтар расказвае: "...В один из погожих осенних дней, в конце сентября, мне с поэтом Михаилом Позняковым повезло выехать с культурно-художественной бригадой Центрального дома офицеров к воинам, участвующим в командно-штабных учениях Вооружённых Сил нашей республики под Борисовом". Уражаннямі і эмоцыямі ад гэтай паездкі Яўген Каршукоў дзеліцца з чытачамі. У гэтай жа рубрыцы друкуюцца вершы Міхаіла Пазнякова, прысвечаныя абаронцам краіны.

У артыкуле "С открытым боли и любви сердцем" Наталля Заяц аналізуе творчасць Васіля Зуёнка і прыходзіць да высновы, што асноўнымі чыннікамі майстэрства пісьменніка з'яўляюцца "глубокий талант, свежесть художественного мировосприятия, жизнеутверждающий пафос, общезначимость проблематики..."

Артыкул Арсеня Ліса "Поэт-академик Петро Глебка" прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння славутага дзеяча краіны. Аўтар расказвае пра лёс Пятра Глебкі, паэтычную творчасць, шырокае кола яго прафесійных зацікаўленасцей.

Лада АЛЕЙНІК

МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Издательское республиканское унитарное предприятие
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

220004, г. Минск, проспект Победителей, 11, тел. (017) 223-48-09; факс 223-83-63
Расчетный счет № 3012200460013 в Московском отд. ОАО Белинвестбанка г. Минска, код 741

от 7.12.2005 № 254

Галоўнаму рэдактару
штотыднёвіка "ЛіМ"

Казлову А.С.

Паважаны Анатоль Сяргеевіч!

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" па ўзгадненню з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь накіроўвае зварот І. Р. Пяшко адрасаваны міністру Русакевічу У. В. Зварот не што іншае, як крытычны артыкул з нагоды прачытання І. Р. Пяшко рамана Алеся Наварыча "Літоўскі воўк".

І.Р. Пяшко просіць дапамагчы, бо "...не надрукуюць".

І выдавецтва "Мастацкая літаратура", і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь хадайнічаюць за І. Р. Пяшко і просім зварот надрукаваць цалкам, без купюр.

Дадатак: на 6 старонках.

Дырэктар выдавецтва
"Мастацкая літаратура" У. А. Мачульскі

МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Издательское республиканское унитарное предприятие
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

220004, г. Минск, проспект Победителей, 11, тел. (017) 203-48-09; факс 203-83-63
Расчетный счет № 3012200460013 в Московском отд. ОАО Белинвестбанка г. Минска, код 741

от 6.12.2005 № 253

Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
(На Ваш № 01-12/П-217 ад 05.12.2005 г.)

Копія: Пяшко І. Р.
231510, г. Шчучын, вул.Заводская, 20--10

Копія: галоўнаму рэдактару
штотыднёвіка "ЛіМ"

Казлову А.С.

Выдавецтвам "Мастацкая літаратура" вельмі ўважліва быў вывучаны зварот І. Р. Пяшко з нагоды прачытання рамана Алеся Наварыча "Літоўскі воўк".

Склалася ўражанне, і небеспадстаўна, што І. Р. Пяшко гэтым зваротам не крытыкуе пісьменніка Алеся Наварыча, а зводзіць рахункі з загадчыкам аддзела прозы часопіса "Полымя" Аляксандрам Іванавічам Трушко.

Чытаем: "Нядаўна аўтар, хутчэй за ўсё як узнагароду за кнігу, назначаны рэдактарам аддзела прозы часопіса "Полымя". А ці не паспяшаліся?.."

І гэтае пытанне І. Р. Пяшко задае міністру інфармацыі. Гэта не што іншае, як спроба паўплываць (націснуць) на Трушко праз начальства і "прапіхнуць" свае творы ў часопіс "Полымя". А творы І. Р. Пяшко, як ён піша: "...абяцалі надрукаваць ў 4-м, потым у 12-м нумарах... Аднак так і не надрукавалі".

Ці не надта мудрагелісты шлях выбраў І. Р. Пяшко? Відавочна, што артыкул ён даслаў чыста крытычны, дык і няхай прачытаюць яго ўсе. Таму мы перадаём яго па прызначэнні -- у штотыднёвік "ЛіМ". Усе кажуць, што ў нас не хапае крытыкі, а яна вось, побач з намі, толькі чамусьці прыхаваная і толькі для начальства. А між іншым І. Р. Пяшко са скрухай адзначае, што напісанае ім "...не надрукуюць". Трэба надрукаваць! Абмеркаванне рамана Алеся Наварыча не пашкодзіць, яно будзе на карысць і чытачам, і пісьменнікам, і асабліва крытыкам.

Галоўны рэдактар
выдавецтва "Мастацкая літаратура" В. А. Праўдзін

Паважаны Уладзімір Васільевіч!

18 лістапада ў Мінску, у фае Палаца прафсаюзаў я купіў кнігу.

Ніколі не думаў, што прачытаўшы яе, буду вымушаны звярнуцца да Вас з лістом.

Гэтая кніга — гістарычны раман Алеся Наварыча "Літоўскі воўк", выдавецтва "Мастацкая літаратура", 2005 г. Выйшла ў серыі "Беларуская проза XXI стагоддзя".

Якая ж яна, проза XXI стагоддзя?

Вось першы радок кнігі: *"Дайно гэта здарылася, да рэвалюцыі яшчэ, нават да японскай, ды і да турэцкай войнаў"*.

Адразу ўзнікаюць пытанні. Да якой рэвалюцыі, дзе, калі, у якой краіне яна была? Што за японская і турэцкія войны? Магчыма, аўтар мае на ўвазе руска-японскую вайну 1904—1905 гг., ці руска-турэцкую вайну 1877—1878 гг. Рэвалюцый было некалькі.

На стар. 26 чытаем: "Стасік перайшоў на шэпт, — думаеце Расія заваявала Каўказ? Чэчня ім адрыгнецца праз сто, дзвесце гадоў. Як і наша радзіма..." Вось дзе прадбачлівасць!

Стар. 27. "Цяпер расейскія жандары ў Вільні хапаюць жанчын і, кажуць, задзіраюць спадніцы на галовы". Вось якія, аказваецца нялюдскія расейскія жандары, проста маньякі ў форме.

Стар. 27. "двухногімі затхлякамі". Хто гэта? Раней літаратура сцвярджала, што чалавек — гэта гучыць горда. Ён — вянец прыроды.

Стар. 37. "Яна — значыць блудніца, лярва і г. д.". Г. Д. — што гэта? Паказчык мастацкасці прозы?

Стар. 39. "Халуёвіна". Каментарыі лішнія.

Стар. 40. "выйшаў на паветра і ўбачыў, што Ганна тралюе праз кветкі".

Стар. 41. "стаў хадзіць па кабінеціку па дыяганалі". Стык літаратуры і матэматыкі?

Стар. 48. "патэнцыйныя". Правільна патэнцыяльныя.

Стар. 50. "У заляпаных балотам нагавіцах".

Стар. 55. "прыкідалі гразёю". Трэба — граззю.

Стар. 58. "На вачах хлопца макрэлі сцежкі ад слёз". Можа — на твары?

Стар. 62. "Еўропа нам паможа". Вельмі знаёма.

Стар. 80. "абвіслымі вусамі, тлустым носам атрымаеш пэндаля пад сракоўе". Прыклад, гаворачы мовай аўтара, выштальконага выразу.

Стар. 85. "распараджаецца, моў сам Гасподзь". У іншым месцы аўтар ужывае "маўляў".

Стар. 88. "апрануў сурдут і боты". Апранаць боты?

Стар. 108. "Я аддам жыццё на карысць нашаму забранаму і зрабаванаму краю".

Стар. 110. "жанчына з ружовымі вуснамі, складзенымі пупачкай". Гэта як?

Стар. 126. "Ганна голасна галасіла".

Стар. 129. "Пані Цэцыля прывыкла ў сваім маёнтку класціся рана, амаль з курамі".

Стар. 134. "Калі б не Расея, мы з году ў год заможнелі".

Стар. 135. "Прынясі, жыдзе гарэлкі".

Стар. 147. "Варшава, Вільня нам дапамогуць". Дапамаглі. Украіне.

Стар. 163. "ён ужо пачаў".

Стар. 182. "Земляў". Трэба зямель.

Стар. 185. "нясвоечасова". Правільна несвоечасова.

Стар. 191. "У паветры смярдзіць дымам". А як быць з выразам "И дым Отечества нам сладок и приятен"?

Стар. 192. "шанец". Правільна шанц ці шанс. Шанец азначае акоп. Адсюль і шанцавы інструмент. Неабходна карыстацца слоўнікам.

Стар. 196. "Вільня дапаможа. Варшава зброю прышле. Вось-вось выступіць супраць цара Францыя".

Стар. 204. "Восенню 1912 года". Але ў рамане апісваюцца падзеі 1863 г.

Стар. 206. "Нас падтрымае Еўропа". Зноў Еўропа, зноў падтрымка.

Стар. 207. "Будзем поўзаць у нагах Еўропы, гэтай маскалёўскай набрыдзі". Тое ж.

Стар. 207. "У ягонай галаве варылася свая каша".

Стар. 209. "якасцяў". Трэба якасцей.

Стар. 214. "экіпаваных". Экіпіраваных.

Стар. 219. "браў тады лапату, якой саджаюць хлеб". Куды?

Стар. 220. "набэдрыкі". Трэба набедрыкі.

Стар. 221. "самыя раздземакраты". Вельмі актуальна.

Стар. 225. "агламазднік". Хто такі?

Стар. 226. "Няўжо марам нашага народа аб вяртанні да цывілізаванага шляху развіцця не дадзена ажыццявіцца?"

Стар. 233. "выкшталцонае, няздатнае да суровага жыцця".

Стар. 237. "Вязнуў у сыпкім дарожным пяску". Грязнуў.

Стар. 239. "пахла нечым незразумелым".

Стар. 245. "трымала нагружаны рознакаліберными бутэлькамі".

Стар. 251. "Не рускія, не расейцы, а свае янычары зробяць так, каб ніхто і не ведаў, што за птушка гімвал".

Стар. 255. "усё-роўна". Трэба раздзельна.

Стар. 256. "вялізазная".

Стар. 260. "Пінскіх балот". Чаму з вялікай літары?

Стар. 264. "подсцілку". Правільна подсціл.

Стар. 267. "уразвалачку". Правільна ўразвалку.

Стар. 280. "вайсковыя часткі". Трэба — часці.

Стар. 281. "грэцкіх". Трэба грэчаскіх.

Ці трэба гаварыць, што гэта толькі невялікая частка тых моўных хібаў, недакладнасцей, памылак, абыякавых адносін аўтара, рэдактараў.

Рэдагавалі кнігу тры стыльрэдактары, рэдактар.

У анатацыі паведамляецца, што гэта востраюжэтны твор, прасякнуты духам авантурызму і ўзбагачаны любоўнай раманнай інтрыгай, запрашае чытача ў час паўстання 1863—1864 гг.

Няўжо тэма паўстання 1863 г. так актуальная сёння?

Дабраўшыся да апошняй старонкі гэтай, як сцвярджае сам аўтар, пісаніны, бачыш — няма тут ні гісторыі, ні рамана. Авантурызм ёсць. Дзе ж новае слова аб паўстанні? Калі няма новага, дык навошта 283 старонкі?

Няўжо ніхто з 15 членаў рэдакцыйнага савета серыі "Беларуская проза XXI стагоддзя" не чытаў гэты опус?

Дарэчы, чаму хаця б аднаго літаратара з шасці абласцей не ўключыць у савет?

Афармленне кнігі бездакорнае. Але ж галоўнае — змест. Тут няма ні ідэі, ні герояў, ні дзеяння, ні сюжэта.

Духам авантурызму нясе і ад рашэння выдаць так называемы гістарычны раман.

Нядаўна аўтар, хутчэй за ўсё, як узнагароду за кнігу, назначаны рэдактарам аддзела прозы часопіса "Полымя". А ці не паспяшаліся? Як будзе з такім багажом аўтар вызначаць якасць твораў, што будуць паступаць у часопіс?

У літаратурных выданнях і газетах першымі сярод маладых літаратараў называюць А. Федарэнку і А. Наварыча. Няўжо за раманы "Нічые" і "Літоўскі воўк"?

Магчыма, узнікне пытанне — чаму пра кнігу я не паведаміў аўтару?

У пятніцу, 25 лістапада, я званіў па нумары, які пазначаны ў выходных даных часопіса. М. Мятліцкі даў нумар, па якім можна пагаварыць з А. Наварычам. Адказала жанчына, што гэта вёрстка, нават пашукала пісьменніка. Я зноў пазваніў М. Мятліцкаму. На гэты раз адказаў намеснік рэдактара У. Марук. Сказаў, што паколькі рабочы дзень скарочаны, то Наварыч пайшоў дамоў. Было гэта ў 14. 30.

Апошні радок кнігі на вокладцы паведамляе аб прэміі. За што?

Ці можна, спасылаючыся на закон аб друку апублікаваць вышэйнапісанае мною ў якім-небудзь (скажам, у тым жа часопісе "Полымя") рэспубліканскім выданні?

Але ж не надрукуюць.

Восем гадоў праляжала мая аповесць у "Полымі". Абяцалі надрукаваць у 4, потым у 12 нумары. М. Мятліцкі ў інтэрв'ю "Звяздзе" назваў аповесць таленавітай.

Аднак так і не надрукавалі.

І. ПЯШКО

29 лістапада 2005 г.

Васіліна ЛЕТНЯЯ

Васіліна ЛЕТНЯЯ (Таццяна МІЦЫГЕВІЧ) нарадзілася ў 1982 годзе ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага раёна. У 2004 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка. Выкладае беларускую мову і літаратуру ў СШ № 2 г. Лагойска.
Першыя вершы ўбачылі свет у мясцовай раённай газеце "Родны край". Празаічныя творы друкаваліся ў часопісе "Вожык" і "Беларускай лясной газеце". З вершамі ў нашым штотыднёвіку выступае ўпершыню.

* * *

Жыцця майго палотнішча саткана
З крыві святой і памяці дзядоў.
Я гонар іх... і іхняя загана,
Калі змарную прадзіва гадоў.

Дзяды на свет глядзяць
маймі вачыма,
Я іх рукамі мацаю зямлю.
Ідзём за родам род, бо немагчыма
Без парастка ўваскрэснуць
зноў камлю.

І дрэву звек не ўзняцца без карэння,
Як песень без гартані не спяваць...
Ды толькі знічка я ад сатварэння,
Мне, падаючы, ззяць і дагараць.

* * *

А мне забыцца б у цішы
Гаючых траў за роснай пожняй,
Знайсці для кволае душы
Крыху святой спагады Божай,
Спазнаць і праўды,
і святла
І перажыць дні ліхалецця,
Каб ведаць: недарма жыла
На гэтым дзіўным белым свеце.

ТРЫЯЛЕТ

Я ўпадабала трыялет,
Нібыта хлопца маладога
На ўсю жыццёвую дарогу.
Я ўпадабала трыялет
І строфам сябра дарагога
Распавяла душы сакрэт.
Я ўпадабала трыялет,
Нібыта хлопца маладога.

* * *

Згубіла патрэбныя словы,
Каб выказаць думкі свае.
Таму назіраю за небам,
Гляджу на людзей і дарогі,
Чытаю чужыя выслоўі.
Ды толькі адказаў не маю.
Няўжо знямела душа?

* * *

Хачу спасцігнуць лёс уласны
І так баюся памыліцца.
Шукаю знакаў у нябёсах,
Да варажбіткі зноў іду,
Бо як, не зведаўшы сябе,
Мне зразумець тваё жыццё?

* * *

Кожны дзень майго жыцця
Пачынаецца з сонца
і думак пра Вас.
Радуюся цёплым промням
І ўяўляю:
Вы таксама ўсміхаецеся ім.
Толькі думаеце не пра мяне.

* * *

Вы ўскалыхнулі маё сэрца,
Не даўшы ніякага шанцу...
І толькі надзея ратуе
мае пачуцці.
Яна ўпарта жыве і верыць,
Даючы тым самым жыццё
і веру мне.

ВІНШУЕМ

З 70-годдзем паэтэсу Ніну ГАЛІНОЎСКУЮ.

З 70-гадовым юбілеем празаіка і паэта Эдуарда СКОБЕЛЕВА;

З 65-годдзем паэта Вячаслава ДАШКЕВІЧА

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

У снежні споўнілася

110 гадоў з дня нараджэння паэта Гіршы КАМЯНЕЦКАГА;

95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра СЯДУРЫ, празаіка, літаратуразнаўца, мастацтвазнаўца;

80 гадоў з дня нараджэння паэта і празаіка Івана ШУЦЬКО;

75 гадоў з дня нараджэння Ганны СОНДАК, літаратуразнаўца і педагога.

Янка ЛАЙКОЎ

* * *

У палёх, сярод высокіх каласоў,
сярод жней і іх тужлівых галасоў
я шукаў цябе,
каханая мая,
я гукаў цябе,
каханая мая...

Неба выспеліла хмараў чараду,
я сачыў па іх з трывогаю бяду;
ўся трывога — аб табе,
каханая мая,
ўсе маленні — аб табе, душа мая.

Зазвінелі, зашапталі каласы:
"Супыніся, сцішся і засні!"

І з іржышча тады выпаўзла змяя
і сказала: "Я — каханая твая."
Мне на грудзі срэбным целам
узлягла,
І змагла мяне тужлівая імгла...

...А калі знайшла мяне каханая мая,
і спаўзла з грудзей атрутная змяя,
я ў іржышча ўрос,
я скамянеў,
неба выплакала слёзы ўсе
па мне,
толькі песня застанецца
ў сумных жней...

* * *

Надышлі самотныя дні,
ахапіла прасторы стома.
Пад нагамі віруе строма,
і над прорваю мы адны.

"Ачуняй! — Я крычу, — не спі,
слодыч сну не спатоліць стому.
Што ні крок —
то бліжэй да стромы,
вось паэзія — бяры, пі!.."

Ты ж сказала: "Твае радкі —
што ні слова — бліжэй да стромы.
Лепей піць асалоду стомы,
чымсьці быць для цябе нікім."

Ачуняў я. Спазнаў тугу
да вар'яцтва, да сну ад стомы.
Але ведаў: сумуе строма,
што над ёй занясу нагу...

De profundis*

Тры ночы — ў чэраве пачвары.
Такіх пачвар у свеце — тры.
І ў кожнай з іх свой кон трывае
той, хто да праўды вечна брыў.

На трох пачварах — чарапаха,
на чарапасе — свет стаіць,
і недзе ў свеце тым Арахна
дасноўвае чыюсьці ніць.

Вакол пачвар і чарапахі
ляжыць бязмежны акіян,
а ў акіяне — бездань страху,
з якога я і акрыяў.

Пасля свае расплюшчыў вочы —
і знік бязмежны акіян.
Кудысьці сплыў мой сон сірочы,
калі памёр Вялікі Пан.

І голас мне гучаў прарочы:
"Чаго ты хочаш, Іаан?"

* * *

Чорны човен плыў паволі ў ноч,
чорны човен хвалі калыхалі,
я з тваіх вачэй не зводзіў воч,
ты мне ціха мовіла:
"Кахаю..."

З-за аблокаў над начной ракой
поўня ўзыдзе і маркотным вокам
на мяне зірне і я спакой
свой згублю,
завыю ў неба воўкам.

Стогне са свайго прадоння поўня:
"Па вадзе на покліч мой пракроч!.."
Воч каханай болей я не ўспомню
і вадзяніком кульнуся ў ноч.

* * *

Жанчына,
якая верыла ў цуды,
Жанчына,
якая аднойчы адкрыла мне каханне,
Жанчына,
чыё цела было маім Храмам,
сышла
назаўсёды
і ніколі больш не вернецца.

Цяпер я —
варажбіт,
апантаны і ўтрапёны,
уладар, які раней быў рабом.

Але я не магу здзейсніць
толькі аднаго:
вярнуць
Жанчыну,
якая сышла
назаўсёды.

* De profundis (лац.) — з глыбіні. Пачатковыя словы каталіцкага пакайнага псалма.

Сяргей ПАНІЗНІК

ГОСЦЬ ВЕКАВЕЧНАСЦІ

Я прыйшоў не з пустымі рукамі,
з дваццацаю — у ахапак — вякамі.
Дваццаць першы спрабуе зырчэць,
хоць у шэрань убраўся, у шчэць.

Два, нуль-нуль набірайце, і шэць.
Код праўдзівы. Мне нельга спазніцца.
Адчыняйце вы дзверы званіцы!
Новы Год — векавечнасці госць.

Я такі перад вамі, як ёсць:
пасярэбраны, мейсцамі поўсць...
І не "круглы" я, не юбілейны;
за праспектамі вузкакалейны.

Зачакаўся астылы народ:
на парозе сугрэў — Новы Год.
Каляндарны зімы паварот.
Я трымаю рукамі бярэмя
спадзяванняў: і хто напярэймы,
той наўпрост апазнае ў анфас
Новы Дзень, Новы Год,
Новы Час, —
і пачуе Айчыны наказ.

Малюнак Ул. ЛУКШЫ

АНЁЛ

Апавяданне

Сяргей ВЕРАЦІПА

І калі над нашым горадам праляцеў Анёл, то хто заўважыў ягоны палёт, хто пачуў ягоную песню, каму бліснула срэбра ягоных крылаў і золата ягоных валасоў.

Ніхто не пачуў, ніхто не заўважыў.

Заўважылі мокры снег з шэрых аблокаў. Пачулі рыпенне тармазоў і выбухі петардаў, ды яшчэ колькі гукаў і колькі відарысаў меў гэты горад, і ўсё гэта заўважылі, і ўсё гэта пачулі... Але толькі самае галоўнае засталося па-за ўвагаю.

Анёл ціха склаў крылы і прызямліўся так мякка і ўдала, што нічога вакол сябе не парушыў. Азірнуўся, бліснуўшы агнём зялёна-блакітных вачэй, і завярнуў праз прытвор. Чарга па свечкі была кароткаю, але яна, як заўсёды наперад не падрыхтавала грошы, і ёй давялося корпацца ў валізцы, адшукваючы кашалёк, праўда тыя, хто занялі месца за ёю, цярпліва маўчалі. Яна паспешліва схавала рэшту і прайшла ўсярэдзіну, не забыўшыся перахрысціцца на абразы. Потым сабралася з духам і цвёрдаю рукой паставіла свечку за Раба Божага В. І тады ўжо ўзялася шаптаць пацеры. І адразу зрабілася лягчэй, і адразу адпусціла. І балючы вобраз адступіўся, расплываўся і знік, ягонае месца заступілі любыя, родныя абрысы. "Родны, мілы, блізкі, але ўжо не каханы. Няхай не будзе болю, няхай станеш мне раднейшым ад брата, толькі няхай не будзе гэтага болю". Сёння спеўнікі стараліся надта ўжо сардэчна і пранізліва, а можа, ёй так падалося. Толькі словы, як бы самі знаходзілі дарогу да сэрца, і слёзы лёгка зрабілі вочы вільготнымі. Яна стаяла і не думала ці глядзіць, хто на яе. Вусны, нібы, самі прамаўлялі патрэбныя словы: "Хай у цябе ўсё будзе добра. Хай ты не будзеш хварэць. Хай станеш моцным, а твае ворагі пазбудуцца сваёй нянавісці. Хай тваёй моцы дастане на ўсё, што ты задумаў..."

Падаў мокры снег, але адразу таяць не хацеў, і хлюпкая кашыца замінала хадзе. На прыпынку чужыя людзі чакалі аўтобуса, яна стала побач з імі пад навес, бо парасона не насіла, але ад людской гаманы да яе далятали толькі нейкія бязглуздыя ўрыўкі, і яна міжволі ўсміхнулася на рознагалосую бязглуздзіцу, але ўсмешка на вусны не прабілася, а засталася недзе там, унутры, дзе і павінны захоўвацца таямніцы. Неўзабаве прыйшоў аўтобус, і яна ўзрадавалася, што не давялося доўга чакаць. У салоне пахла згарэлаю гумаю і вільгаццю. Яна села і пачала ўзгадваць, што ёй патрэбна, потым свой дзень надалей: вось яна прыедзе, крыху паспіць, потым паабедае і ўвесь астатні час аддасць вучобе, ці слуханню музыкі. Такі план цалкам задавальняў, і яна ціхенька ўзялася разглядваць пасажыраў. Людзей было не багата: бабулька ў шэрым зношаным палітоне на першым сядзенні, два падлеткі з выбеленымі чубамі, ля выхаду стаяў мажны мужчына з сур'ёзна-калючымі вачыма і з сур'ёзна-важкаю на выгляд валізаю. Яшчэ была маладая, густоўна апранутая кабета, на першы позірк вельмі юная. Але ў ейных сініх вачах праглядваўся такі боль і разуменне, якія юнымі гадамі не ўсведамляюцца. Нейкая невядомая думка цалкам забрала ўвагу жанчыны, і было адчувальна, што думка гэтая не з самых радасных, бо між чорных зрослых броваў пралягла маленечкая, амаль незаўважная складачка, вусны, толькі дзеля выгляду пафарбаваныя, сціснуліся ад напругі, а тонкая рука без пальчаткі неяк сама па сабе адкідала з чыстага лба пасмачку густых, чорных да сівізны валасоў. І ёй раптам захацелася, каб гэтыя думкі былі чыстыя і высокія, і за імі абавязкова стаяла прыгожая рамантычная гісторыя. Але тут шафёр абвясціў ейны прыпынак. Па дарозе ёй патрапіўся таксафон, і прыйшла думка пазваніць. Яна здолела прайсці міма таксафона, але адчула, што дзень складаецца не так ужо і добра, як запланавала. Зноўку стала балюча і неяк пуста. У гэтую пустэчу ўжо гатовы быў забрацца халодны чорны адчай. Яна сцяла зубы, ускінула галаву і весела ўсміхнулася: вось такою яе ведаюць, вось такою яна павінна быць на людзях.

Перад самым уваходам звярнула ўвагу на постаць, што падалася ёй знаёмаю і блізкаю. Яна нават паспела спалохацца, што В. сам прыцёгся сюды і зараз пачне вымагаць балючых высвятленняў адносін. А ёй так хапіла, аж занадта для ейных гадоў. За якія грахі? Але гэта быў не В., хаця і вельмі падобны: тыя ж русыя валасы, сінія вочы, той жа крыху вышэй ад сярэдняга рост. Так, гэта быў не В, і можна лічыць за ўдачу, і таму яна не ўтрымалася ды зірнула незнаёмцу ў твар. Позірк у адказ быў глыбокім, цёплым і ласкаюча-ветлівым. "У людзей такога не бывае", — падумала яна і адразу ж сябе падправіла, — не бывае ў нашых людзей".

Дзень склаўся паводле ейнага плана. А вечарам да іх у пакой зазірнуў адзін прыяцель. Яны сядзелі на жоўтым кіліме, балбаталі пра рознае, слухалі музыку, пілі каву з печывам. І яна была радая, што ўдалося не патэлефанаваць, і што прыяцель так весела заняў ейны час, і ёй патрэба сёння чуць па-за абыякавымі словамі пра надвор'е пакутлівага крыку: "Пра-а-па-а-да-аю!"

Ён зірнуў за акно, і яго ажно перасмыкнула. Там падаў мокры снег, але таяць не хацеў і паўсюдна ўтвараў гразкую кашыцу. Ён бы і не выйшаў на вуліцу, на слоту, але ў лядоўні пуста, а ў роце суха. Ён уздыхнуў, быццам хацеў гэтым уздыхам выказаць усю суветную тугу. Пра ўчарашняе ўзгадваць не хацелася, бо дапякаў сорам за ўтоплены ў гарэлцы дзень і за такі ж вечар, і за ўжо незлічоную колькасць такіх дзён і вечароў. Ён з задавальненнем не пайшоў бы на вуліцу, бо да згрызотаў сумлення дадаваўся страх перад людзьмі, машынамі, дрэвамі, будынкамі. Усе яны падаваліся яму агрэсіўна-варожымі, і душа ягоная ў такія часіны сціскалася, гатовая збегчы ў краіну, якую ведала адна яна. Ён гэтае краіны не ведаў.

Чарга па піва на дзіва невялікая. Можа, гэтаму паспрыяў мокры снег. Ён выпіў два куфлі запар. Першы, які належыць у такой сітуацыі, ён спустошыў дробнымі глыточкамі, а другі — амаль за адзіны выдых. Двухлітровы пластык ён паклаў у пакет — гэта на потым. У краме бавіўся нядоўга і выбраў "Белую Русь". Маладзенькая прадаўшчыца неяк жаласліва зірнула яму ў вочы. "Не трэба мяне шкадаваць", — хацеў спачатку сказаць ён, але ўстрымаўся. Замест гэтага шпарка пакрочыў дадому.

Зараз будзе добра, зараз будзе ўсё як належыць, а значыць — жыццё працягваецца. Ён хутчэй скінуў боты і зірнуў на тэлефон, які яго сёння пабудзіў, ён хістаючыся рвануўся да слухаўкі, але спазніўся, на тым канцы ўжо маўчалі. "А раптам гэта была яна? А можа, яшчэ патэлефануе? Ну пазвані, пазвані! А што тады? Што ўжо можна зрабіць? Як перавярнуць, як адкруціць усё назад і пераіграць па-іншаму?" Думкі з'явіліся самі па сабе, і ён не здолеў перапыніць іхняе хады. Ясна ўявіў сабе пакрыўджаны рот, поўныя болю сінія вочы, ганарліва ўскінуты падбародак і рашуча рвануў тэлефонны шнур. Не трэба яму ніякіх званкоў, бо ўсё яшчэ так жыва і балюча. Потым ён сеў да стала, дастаў чысты аркуш, зверху адзначыў яго датаю і напісаў: "Ты! Люблю цябе. Кепска мне..." Больш нічога напісаць не ўдалося. І тады ён адпіў напрост з рыльца, зажаваў кіслай капустай. Потым закурыў і падышоў да акна. Там сярод падаючага мокрага снега стаяла яна. Ён лічанымі секундамі зляцеў уніз, але, здаецца, сэрца ляцела яшчэ шпарчэй: да яе! Гэта была не яна. Ён у які раз памыліўся. Але дзяўчына зірнула на яго па-добраму — цёпла, шчыра і прыязна, з разуменнем развяла рукамі. Ён таксама ўсміхнуўся, стараючыся, каб усмешка была як мага мягчэйшаю і панылa пабрыў па прыступках. На стале стаяла амаль апалавіненая пляшка і ляжаў недапісаны ліст: "Ты! Люблю цябе... Планаў на вечар у яго не было, але як заўсёды дапаможа інтуіцыя.

Анёл расправіў крылы, мякка пасміхнуўся агнём сваіх смарагдавых вачэй і ціха паімкнуўся да неба.

І калі над нашым горадам праляцеў Анёл, то хто заўважыў ягоны палёт, хто пачуў ягоную песню, каму бліснула срэбра ягоных крылаў і золата ягоных валасоў. Ніхто не пачуў, ніхто не заўважыў. Ні самі людзі, ні іхнія чуйныя прылады, якімі яны стараюцца замяніць свае аслеплыя і аглухлыя сэрцы.

Алена ЦЫРУЛЬНІКАВА

ВАРАЖБА

Апавяданне

У ноч на Нараджэнне Божае Млада затапіла лазню. З паўтузіна сяброўак, раскрыўшы рты, назіралі за ёй. Дзяўчына аднесла ў дамок з бярвення два невялікія люстэркі, дзве тоўстыя васковыя свечкі і чорную курыцу, пазычаную ў суседкі Мар'і — худзенькай увішнай бабулькі, якая трымала трох пеўняў, ды з дзесятак курэй. Чубатка моцна кудахтала.

— Навошта яна табе? Певень патрэбны, толькі каб зусім чорны! — аўтарытэтна раілі сяброўкі. — Мар'ін Афонька якраз падыдзе.

І Млада пабегла назад: абменьваць курыцу на пеўня.

— Дзетка, навошта табе певень? — хітра прыжмурвалася бабулька.

— Варажыць, цётка Мар'я, — весела адказвала дзяўчына. — Хутка шаснаццаць споўніцца, час і аб жаніху падумаць!

Мар'я ківала галавой і хрысцілася.

Зусім падрыхтаваная, Млада стаяла каля дзвярэй лазні.

— Ты ж зацурацца не забудзь! — шаптала Хрысціна, самая блізкая прыяцельніца. — І пеўня за хвост патузай. Толькі запяе — тут жанішок і згіне. Нічога вострага на стале няма?

— Толькі лыжкі, — Млада агледзела столік, на якім стаялі талеркі з блінамі і кашай.

— Ну, ідзі, ідзі! — моцна зашыпелі дзяўчаты. — Раскажаш пасля.

Млада села за стол. Люстэркі, пастаўленыя насупраць адно аднаго, утваралі бясконцы калідор з дрыжачымі агеньчыкамі свечак.

— Суджоны-ражоны, прыйдзі павячэрай! — хрыплым ад хвалявання голасам прагаварыла дзяўчына. — Суджоны-ражоны, прыйдзі павячэрай!

На некалькі секунд у лазні ўсталявалася напружаная цішыня. Потым полымя свечак задрыжала, затрапяталася, захісталася, ледзь не зрываючыся на стол. Млада знерухомела, адчуваючы, як па спіне бягуць мурашкі. Лазню напоўніў востры пах серы. Бярвенні, з якіх былі складзены сцены, заскакалі, затанцавалі, у шчылінах бялеў снег. Пах серы рабіўся нясцерпным, знадворку нешта заскавытала, заскрэблася і затрашчала; лазню ліхаманіла, здавалася, што яна вось-вось разваліцца. Здавалася, на вуліцы шалелі ўсе д'яблы з прадоння.

Заміраючы ад жаху, дзяўчына ўсё ж знайшла ў сабе сілу зазірнуць у цёмны калідор люстэркаў. Але там было пуста. Нічога і нікога акрамя языкоў полымя, што асвятлялі празрыстую паверхню шкла. За бярвеннем яшчэ раз грымнула, і ўсё сціхла. Агеньчыкі свечак супакоіліся, гарэлі роўна. Нясцерпны смурод знік. Млада асцярожна ўздыхнула і паднялася. І тут расчыніліся дзверы, упусціўшы ў натопленае памяшканне парыў ледзянога ветру.

— Дзяўчаты? — няўпэўнена спыталася дзяўчына, спрабуючы суняць шалёнае сэрцабіцце.

— Хлопцы, — аксамітным барытонам адказала цёмная фігура.

Зноў пацягнула пахам серы. Млада скамянела.

— Што не запрашаеш? — постаць спынілася на парозе.

— Суджоны-ражоны, прыйдзі павячэрай, — дрыжачымі вуснамі прашаптала дзяўчына.

Ён падышоў. Прыгожы хлопец, шыракаплечы і смуглы. На твары гарэлі цёмныя бліскучыя вочы пад густымі брывамі. У паветры лятаў слабы, але адчувальны пах серы.

— Частуй, прыгажуня, — госць сеў побач, зачэрпнуў лыжкай кашу, пажаваў, адсунуў талерку. — Каша — гэта, канечне, добра. Але хіба каша ды бліны — ежа для мужчыны? Паставіла б смажаніну, паклала вострыя нажы. А?

Млада дрыжала.

— Ну добра, — злітаваўся госць, — ведаю, усе дзяўчаты каштоўныя каменьчыкі любяць. Глядзі, што ў мяне ёсць!

Перад вачыма Млады з'явіўся ружанец з самацветаў, якія пераліваліся ад блікаў свечак. Хлопец зашчапіў яго на шыі дзяўчыны.

— Гэта мой вясельны падарунак. Чакай, прышлю сватоў.

Дзверы рыпнулі. Суджаны пайшоў. У прыадчынены праём уварваўся парыў ветру, і свечкі згаслі. Цемру працяў прыглушаны ўскрык.

* * *

Доўга стаялі дзяўчаты каля прысадзістай лазні. Пераступвалі з нагі на нагу, падскоквалі, ляпалі рукавічкамі, услухоўваліся ў цішыню. Невялікі будынак стаяў быццам велькі валун — упэўнена. Дзверы шчыльна прычынены. З сярэдзіны не даносілася ані гуку. Нарэшце, калі зоркі ў ясным марозным небе пачалі цьмянець, пачуўся слабы ўскрык. Дзяўчаты кінуліся да дзвярэй, загрукталі ў іх. Потым узнялі гвалт, з-за якога прыбеглі суседскія мужчыны і выламалі дзверы.

З лазні вылецеў ашалелы певень, а на падлозе ляжалі паваленыя свечкі.

— Добра, патухлі, — прамармытаў нехта. — Загарэлася б усё к чорту...

Затым позіркі ўсіх перамясціліся на падлогу паўз сцяны. Млада ляжала на спіне. З перакошаным тварам ад жаху. Люстэркі былі разбіты ўшчэнт.

МАРЫ МАЭСТРА...

23 снежня ў Палацы культуры Маладзечна — прэм'ера. Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны М. Фінберга прадстаўляе новую праграму "Анталогія беларускай паэзіі ў песні". Дакладней, гэта будзе толькі яе першая частка, складзеная з трох канцэртных праграм. Прагучыць больш як 30 лепшых твораў беларускіх паэтаў і кампазітараў XVI — XXI стст. Няцяжка сабе ўявіць, які атрымаецца іх пералік... Праз нейкі час прэм'еру пакажа БТ — у праграме трох зімовых тэлевечароў. Маэстра паведаміў, што да ўвасаблення незвычайнай эстраднай анталогіі ён ішоў амаль 20 гадоў — роўна столькі, колькі працягваецца дзейнасць створанага ім аркестра. Так, у аркестра неўзабаве — юбілей. "ЛіМ" спраўна вядзе своеасаблівы жыццяпіс калектыву, таму не будзем паўтараць ужо вядомыя старонкі. Проста пагутарым з М. Фінбергам...

— Міхал Якаўлевіч, сёлетні год у біяграфіі вашага аркестра знамянальны наданнем яму высокага звання "Нацыянальны". Што гэта значыць для калектыву?

— Раней званне "нацыянальны" было проста назвай. Сёння гэта азначае асаблівую годнасць, асабліва сур'ёзны статус, бо званне "Нацыянальны" даецца Указам Прэзідэнта краіны. І цяпер гэта ўжо не назва, гэта ўжо сутнасць. І ў гэтай сутнасці, я лічу, мы разабраліся ад самага пачатку нашай дзейнасці, якая складаецца з некалькіх вядомых вам напрамкаў. Мы ніколі не адмовіліся ад беларускага — за ўвесь час нашай працы. Заўжды падтрымлівалі беларускае. І калі многія ставіліся да гэтага, скажам так, без увагі, дык мы заўсёды былі з беларускай музыкай, з беларускім словам, з класічнай беларускай паэзіяй, з айчыннымі кампазітарамі. Гэта пацвярджаюць аўтарскія канцэрты кампазітараў, вечарыны-канцэрты паэтаў, якія мы сыгралі. Усіх — 22 паэты, 22 праграмы: гэта вельмі шмат, калі ўлічыць, што нам яшчэ няма дваццаці гадоў. Прычым гралі не проста творы, якія былі, а многае мы стварылі самі. Напрыклад, на вершы Уладзіміра Караткевіча існавалі адна ці дзве песні. А мы стварылі цэлую праграму. Праграма "Максім", прысвечаная Багдановічу, — цалкам твор нашага аркестра. Канцэрты да юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа — таксама. Як і праграмы з твораў на вершы Адама Міцкевіча, Аркадзя Куляшова... І яшчэ — мы шмат зрабілі ў інструментальнай джазавай музыцы — ізноў жа, таго, што спрычынена да беларускага. Ведаеце, я працаваў калісьці ў аркестры, на той час эстрадна-сімфанічным, Беларускага тэлебачання і радыё. Там стараліся граць беларускую музыку. Але яе было вельмі мала. Асноўнае зроблена вось цяпер, калі багата напісана і сыграна музыкі менавіта беларускай. Эстраднай і джазавай музыкі! На жаль, яна таксама, як і старонкі нашых тэматычных песенных праграм, сёння не надта часта гучыць па радыё...

Што такое для калектыву вызначэнне "Нацыянальны"? Гэта нібы "адзіны", непаўторны: я так бачу гэтае слова. Яно азначае і вялікую адказнасць. Быць адзіным, непаўторным, адказным — Нацыянальным! — гэта вельмі сур'ёзна. Гэта справа для людзей, якія сапраўды працуюць не проста самі па сабе, а "ў спалучэнні": з навукай, з вельмі адукаванымі спецыялістамі. І самае галоўнае — гэта людзі, якія не здавольваюцца сваімі набыткамі, якія не задаволеныя сваімі дасягненнямі, бачаць ва ўласных поспехах штосьці, не да канца зробленае. І перажываюць за гэта. І адначасова ідуць далей і растуць. Ведаеце, арганізаваць дзесяткі беларускіх фестываляў — гэта вельмі цяжка: і правесці, і самім удзельнічаць у іх. Пяць Беларускіх фестываляў камернай музыкі ў Заслаўі, адзінаццаць у Нясвіжы... У нашай фестывальнай геаграфіі — Мсціслаў, Мір, Тураў. Увосені 2006-га распачынаем у Стоўбцах фэст "Міншчына спявае з аркестрам". З 1993 года мы працуем над Нацыянальнымі фестывалямі паэзіі і песні ў Маладзечне, і невыпадкова прэм'ера "Анталогіі..." адбываецца менавіта там .... Праведзена 14 міжнародных фестываляў джаза ў Мінску. І фестывалі ды аўтарскія канцэрты, адпрацаваныя ў Маскве. І фестывалі, у якіх мы толькі ўдзельнікі...

Як вядома, важны напрамак нашай дзейнасці — праца з малымі гарадамі. Мы першыя ў краіне гэта зрабілі, і зрабілі, падаецца, сур'ёзна. І назаўжды. У гэтым падтрымлівае нас і Прэзідэнт Беларусі, падтрымлівае і ўся палітыка нашай краіны... Адзначу, што ўжо некалькі гадоў запар займаем першыя месцы па абслугоўванні сельскага гледача. Пра гэта шырока не гаворыцца, але ж гэта вельмі сур'ёзная справа.

— Сур'ёзны калектыў — сур'ёзныя дасягненні. І адзнакі адпаведныя. Званне "Заслужаны калектыў". Званне "Нацыянальны". Падзякі Прэзідэнта Беларусі. Званне лаўрэата тэлефестывалю "Песня года" ў Расіі. Закладка вашай імянной зоркі на славутай плошчы ў цэнтры Масквы...

— Гэта, як я ўжо неаднойчы казаў, — не персанальная адзнака, а прызнанне нашай Беларусі, таленавітага народа нашай краіны. Прызнанне беларускага мастацтва. Гэта азначае павагу да самога нашага унікальнага калектыву. І, між іншым, заўважу, што адным з напрамкаў нашай дзейнасці з'яўляецца пошук новых талентаў. І не толькі пошук, а і ўводзіны ў прафесію. Ну, і яшчэ б я дадаў тое, што мы ўсё ж з'яўляемся пасланцамі нашай краіны за мяжой, у першую чаргу — у Расіі. Пад акампанемент аркестра закладзена вялікая колькасць зорак ва ўшанаванне вядомых майстроў эстрады. Многія важныя канцэрты ў зале "Расія" ладзіліся пад акампанемент нашага аркестра. Нават святкаванне 800-годдзя Масквы прайшло, умоўна кажучы, на базе менавіта нашага калектыву. І фестываль "Ступень к Парнасу". Мы запісалі больш як 600 праграм для перадачы "Адгадай мелодыю" на ГРТ. І мноства аўтарскіх праграм выдатных савецкіх і расійскіх кампазітараў...

Аднак мы выгадавалі цэлую плеяду і сваіх, беларускіх эстрадных выканаўцаў. Успомніце: калі пачынаў утварацца аркестр, на той час былі Тамара Раеўская, Віктар Вуячыч, Юрый Смірноў. Былі "Песняры"... Вось амаль і ўсё, бо на вялікай эстрадзе дазвалялася спяваць толькі тым, хто станавіўся лаўрэатам усесаюзнага конкурсу — не менш.

— Сапраўды, аркестр адкрыў столькі новых імёнаў...

— Пошук новых імёнаў — адзін з напрамкаў нашай дзейнасці. І не толькі салістаў-спевакоў. Паглядзіце, колькі мы выхавалі таленавітых інструменталістаў — гэта цяпер сапраўдны набытак нашай краіны! Падрыхтоўка музыкантаў-спецыялістаў такога кшталту ў навучальных установах нашай краіны, на жаль, нездавальняючая. Таму дапамагаць маладым талентам, падтрымліваць іх, лічу, — клопат аркестра.

Нацыянальны... Мы прыйшлі да сутнасці гэтага вызначэння праз невялікія беларускія гарады, мястэчкі, у якіх жывуць простыя беларускія людзі. І ў гэтых малых гарадах самі выхавалі новага слухача. Ён ужо ведае, што значыць камерная музыка, не баіцца гэтага слова і з прыемнасцю ідзе на канцэрты, якія збіраюць там аншлаг. Гэта гаворыць пра ўнутраную культуру нашых несталічных людзей. Наогул, аркестр робіць за год у сярэднім 27 новых праграм і 10—12 фестываляў. Здавалася б, усё ўсталявалася за 20 гадоў. Але мы пастаянна працуем над сабой і ведаем, што нам рабіць далей.

— Неаднойчы вы казалі: "Мая сям'я — гэта мой аркестр. Аркестр — гэта ўсё маё жыццё"...

— Так і ёсць. Я быў жанаты. Развёўся. У мяне ёсць ад гэтага шлюбу сын. Але ўжо амаль 20 гадоў я жыву адзін... Ды, урэшце, калі б я быў не адзін, гэтага аркестра не было б. Вельмі складана — сумяшчаць і тое, і тое... Таму шлюб у мяне не атрымаўся, фактычна мая сям'я, як я даўно казаў, — гэта мой аркестр. Так вось я і працую, так і жыву і, урэшце, усё жыццё сюды ўклаў і больш нічога ў мяне няма.

— Дзяцінства любіце ўспамінаць?

— Ведаеце, у мяне дзяцінства ў такім... звычайным разуменні не атрымалася. Сям'я была вялікая і незаможная: маці — простая вясковая жанчына з-пад Мазыра, з вёскі Мялешкавічы, усё жыццё працавала прачкай. Бацька, чалавек рабочы, хадзіў на працу з вёскі ў Мазыр. Ваяваў на фронце. У вайну загінулі мае старэйшыя брат і сястра. Яшчэ адзін брат (яго таксама ўжо, на жаль, няма на гэтым свеце), што называецца, выйшаў у людзі, быў ваенным, працаваў адвакатам. Ну, а я вучыўся ў музычнай школе ў Мазыры: пачынаў на скрыпцы, гады тры правучыўся, потым займацца на скрыпцы мне зрабілася цяжка, пачаў шукаць штосьці іншае, "перабіраць" розныя інструменты, перайграў на ўсіх духавых... Але мяне з музычнай школы ўсё роўна выключылі, таму што калі педагог пачуў, як я падбіраю музыку па слыху, прыпомніў мне прапушчаны ўрок, абурыўся... Неўзабаве я пакінуў дом і стаў выхаванцам вайсковага аркестра. Амаль 10 гадоў служыў у арміі ў гэтай якасці. Служба вельмі паўплывала на мяне: на характар, на фарміраванне асобы, на мой лёс. Я пачынаў служыць у Расіі, у Курску, потым перавёўся ў Мінск, у аркестр штаба БВА, тут жа ў Мінску, не закончыўшы музычнае вучылішча, паступіў у кансерваторыю, кансерваторыю скончыў экстэрнам, потым і аспірантуру.

— Ведаю, што вы былі паспяховым трамбаністам, заваявалі званне лаўрэата Усесаюзнага конкурсу джазавых выканаўцаў у Ліепае — у 1967 годзе. Ужо больш як 30 гадоў працуеце у Беларускай акадэміі музыкі, выкладаеце ансамбль, маеце званне прафесара... А дырыжорская прафесія?

— Я пра гэта марыў, імкнуўся да яе, але не думаў, што калі-небудзь мара спраўдзіцца, бо вакол было 25—30 канкурэнтаў... Даводзілася даказваць сваё права на прафесію дырыжора толькі ўласнай працай, прычым даказваць — усё жыццё. Памыляюцца тыя маладыя людзі, якія думаюць: атрымаў адпаведны дыплом — вось ужо ты і дырыжор. Усё куды больш складана. Трэба ведаць сёння, што будзеш рабіць, як мінімум, праз 3-4 гады. Уяўляць, усведамляць, што і дзеля чаго ты робіш, да чаго ўрэшце імкнешся. Вядома ж, куды прасцей — "накідаць" у праграму самых розных твораў, прадставіць гэта як нейкі канцэрт. Ну, і — што далей?.. Мне пашанцавала сустрэць многіх таленавітых і эрудзіраваных музыкантаў, дырыжораў, вялікіх прафесіяналаў, у якіх вучыўся і, напэўна, буду вучыцца ўсё жыццё...

— Міхал Якаўлевіч, а вас ніколі не спакушала мастацтва аранжыроўшчыка?

— Я аранжыраваў вельмі многа. Напісаў багата музыкі. Проста ніколі гэтым не хвалюся. Калі працаваў з аркестрам цырка, напісаў музыку да больш як 150 цыркавых спектакляў, удзельнікамі якіх былі, напрыклад, улюбёнец публікі, народны артыст СССР Алег Папоў, Мсціслаў Запашны... Але калі я прыйшоў у гэты, створаны ў 1987 годзе аркестр, вырашыў: трэба спыніцца, бо я мушу ўзняць творчую якасць аркестра на сто-тысячу працэнтаў, і мэтазгодна будзе вызначаць задачы для адпаведных спецыялістаў, патрабавальна і непрадузята ацэньваць іх працу, а не самому працягваць займацца, напрыклад, аранжыроўкамі.

— Дарэчы, вашы захапленні ў вольны час?

— Вольнага часу ў мяне вельмі мала. Я шчыра скажу: у мяне практычна не бывае ні субот, ні нядзель. Адпачываю я таксама няшмат — дзён 10—12, толькі ў Беларусі. Заўжды адпачываю на Нарачы. А сёлета адпачываў пад Гародняй у новым санаторыі. З Беларусі нікуды не выязджаю. Захапленні?.. Галоўнае — гэта ўсё ж такі аркестр. Я не сказаў бы — праца, а менавіта — аркестр. Аркестр, музыка, творчасць — вось гэта самае галоўнае захапленне. Нічога іншага, бадай, няма, калі не лічыць, што захапляюся трошкі саунай. Хадзьбой. Раней сапраўды захапляўся — любіў вельмі — ездзіць на машыне: недзе больш як 30 гадоў я праездзіў за рулём...

— І ўрэшце ўпадабалі раніцнія праходкі па Мінску?

— У мяне ёсць свой маршрут, які сяды-тады, вядома ж, мяняю. Але штоpання праходжу каля васьмі кіламетраў. А калі па Мінску іду, я ганаруся нашым горадам. Я наогул ганаруся тым, што жыву ў Беларусі. Я люблю сваю краіну. Гэта цудоўная краіна. Краіна, якая стварыла ўсе магчымасці для чалавека: кожны можа развівацца, можа вучыцца і потым зрабіць усё, што павінен, для грамадства, для сваёй краіны. Усё гэта адчуў на сабе і я. Не скажу, што зрабіў ужо ўсё, што мог. Але паспрабаваў зрабіць многае, мабыць, і тое, чаго не мог, — таксама ...

— Міхал Якаўлевіч, а ці ёсць у вас, мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора такога вялікага складанага калектыву, творчы паслядоўнік, пераемнік, памочнік у аркестры?

— Ведаеце, я вельмі хацеў бы, каб з асяроддзя творчай моладзі вылучыўся і з'явіўся ў нас такі малады хлопец, які імкнецца стаць дырыжорам. А дырыжор — гэта прафесія... шматабдымная, убірае ў сябе многія напрамкі музычнай тэорыі і дзейнасці. Дырыжору трэба мець выдатны слых, добры густ. Дырыжор павінен абавязкова быць і рэжысёрам. Наогул — высокаадукаваным чалавекам. Ён павінен па-сапраўднаму, што называецца, па вялікім рахунку любіць сваіх музыкантаў. І па-сапраўднаму любіць сваю краіну, быць ідэйна выхаваным чалавекам. Хацелася б, каб я сёння знайшоў такога чалавека. Ды, на жаль, пакуль не ўдаецца. Калі я хацеў стаць дырыжорам, а гэта быў 1970 год, — побач ішлі чалавек 25—30, якія таксама марылі пра дырыжорскую прафесію. І паміж намі, не сакрэт, было спаборніцтва, якое не афішавалася, і трэба было шмат чаго дасягнуць, каб зрабіцца дырыжорам.

— Марамі не падзеліцеся?

— Мара толькі адна: каб аркестр у мяне быў на вышыні. Каб ён быў такі жывы і творчы, як цяпер. Каб ён быў самым лепшым аркестрам.

— Дарэчы, вы столькі для гэтага зрабілі — найперш, мабыць, падбіраючы высокапрафесійную, таленавітую, творчую каманду, у якой заўсёды цанілі кожнага чалавека. Нягледзячы на ваш клопат, на высокую арганізацыю працы, на павагу да індывідуальнасці людзі, бывае, пакідаюць калектыў. У выніку з'яўляюцца новыя "зычліўцы", а ёсць жа і даўнія зайздроснікі...

— Канечне ж, мяне многія людзі пакрыўдзілі. Нават не тое каб пакрыўдзілі... Паступілі груба ў дачыненні да мяне і нават да ўсяго калектыву. Але я на іх крыўду не трымаю. Бо чым старэйшы я раблюся, тым хутчэй, мабыць, мудрэю. І я ім дараваў. Але я хацеў бы, каб ім дараваў Бог... Аркестр жа наш, як вядома, ужо рыхтуецца да свайго 20-годдзя. Напышлівых і гучных урачыстасцей не плануем, пастараемся адзначыць гэты юбілей сціпла і годна, у атмасферы шчырай творчай вечарыны.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота А.Мацюша

Яднайцеся, закаханыя!

Сапраўднае каханне не ведае перашкод. Гэта, можа, не зусім арыгінальная, але, безумоўна, слушная думка і заняла галоўнае месца ў спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага "Ніначка", пастаўленага паводле п'есы французскага драматурга М. Ланж'еля рэжысёрам Барысам Луцэнкам.

Герой — адвакат, якога захапляюць скачкі з парашутам, аўтагонкі, бокс і альпінізм. Далікатны, вытанчаны француз з прыгожым імем Леон (С. Чэкерэс).

Гераіня — камсамолка, спартсменка, якая валодае шашкай і кулямётам. Асаблівыя прыкметы: бывае прывабнай. Сапраўдная бальшавічка, жалезная дама з меладычным імем Ніначка (Г. Маланкіна).

Здаецца, у гэтых людзей нічога агульнага і быць не можа. Аднак лёс — непрадказальная рэч: дык чаму б французу-капіталісту не пакахаць савецкую дзяўчыну, чаму б дзеля яе не страціць усю сваю маёмасць, чаму б дзеля кахання не зрабіцца такім, якім яна хоча яго бачыць? Усё гэта варта таго, каб адноічы пачуць з яе вуснаў: "Ты — апошні чалавек, якога я маю права кахаць!.. Я — апошняя жанчына, з якой ты маеш права ажаніцца!"

Так М. Ланж'ель сумяшчае ў сваёй п'есе несумяшчальнае, а рэжысёр Б. Луцэнка па-майстэрску ўвасабляе гэта на сцэне. Спектакль атрымаўся не зусім звычайны. Адным з галоўных герояў пастаноўкі робіцца кінаэкран, які каменціруе ўсё, што адбываецца на сцэне: ён знаёміць гледача з дзейнымі асобамі, даючы ім пры гэтым кароткую характарыстыку; паказвае прыгожыя вулачкі Парыжа, якія нават пры вельмі вялікім жаданні немагчыма стварыць на сцэне. Такі рэжысёрскі ход вельмі ўдалы. Да таго ж, яшчэ раз даводзіць, што тэатр і кіно могуць існаваць разам і арганічна дапаўняць адно аднаго. (Між іншым, знаўцы называюць гэты твор своеасаблівай варыяцыяй на тэму аднайменнай амерыканскай кінакамедыі 1939 года з удзелам легендарнай Грэты Гарба. — **Рэд.**).

"Парыж — гэта свята, якое заўсёды з табой", — так калісьці напісаў Э. Хэмінгуэй. Ягоныя словы ўвайшлі ў гісторыю, і, пэўна, зараз цяжка прыгадаць выказванне, якое больш трапна характарызуе гэты горад. Непаўторную рамантычную атмасферу Францыі стварае музыка Ф. Лемарка, А. Бэці, У. Касма, іншых тамтэйшых кампазітараў.

Спектакль пастаўлены ў жанры меладраматычнай камедыі. Нягледзячы на вялікую колькасць рэвалюцыйных лозунгаў (кшталту: "Рэвалюцыя на маршы! Яна пераможа!", "Лінія партыі — не кідаць словы на вецер!") і мноства такіх слоў з нашага гістарычнага мінулага, як "пралетарыят", "народныя масы", "загніваючы капіталізм", пастаноўка атрымалася вельмі сучаснай і цікавай.

Каларытныя і запамінальныя героі спектакля не дадуць гледачу засумаваць. Добрую і шчырую ўсмешку выклікае "тройка савецкіх таварышаў" у складзе Бібінскага (А. Ждановіч), Іванова (В. Грачухін), Бранкова (В. Быкаў). Не пакідае публіку абыякавай і вынаходлівасць маладога Рэнэ (У. Глотаў), у якога атрымліваецца быць добрым і карысным для ўсіх, уключаючы сябе ж. Безумоўныя сімпатыі выклікаюць Ніначка, з яе шчырасцю і верай у непарушныя савецкія ідэалы, і Леон, з яго рамантыкай і вынаходлівасцю.

Тэма кахання заўсёды была, ёсць і будзе самая актуальная. Гэта адзінае пачуццё, здатнае разбурыць час і адлегласць, сацыяльныя няроўнасці. Гісторыя ведае мноства прыкладаў усемагутнасці кахання: толькі яно магло аб'яднаць здавён варожыя роды, падараваць жыццё апанаванаму адчаем і расчараванаму. Дзеля кахання людзі здзяйснялі неверагодныя ўчынкі, за каханне яны паміралі. А Парыж... Ці ж гэта не насамрэч ідэальнае месца для двух сэрцаў, якім лёсам наканавана быць разам? Ніначка і Леон знайшлі адно аднае ў Парыжы. Тут нарадзілася іх пачуццё, і нішто не здолее яго знішчыць. Яны шчаслівыя і заклікаюць нас: "Закаханыя ўсіх краін, яднайцеся!".

Таццяна ІЛЮКОВІЧ

Фота М. Жоглы

ФЕСТЫВАЛЬНАЯ МАЗАІКА

На памежжы восені й зімы філарманічныя канцэрты па ўсёй краіне праходзяць пад знакам Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Беларуская музычная восень". Сёлета ён быў ужо 32-гі. У сталіцы яго адкрыццё, як вядома, прысвячалася 80-годдзю з дня нараджэння Юрыя Семянякі. Было яшчэ некалькі канцэртаў "Восені", прысвечаных творчасці айчынных аўтараў. У Вялікай зале сталічнай філармоніі выступілі Сімфанічны аркестр Белтэлерадыё і Нацыянальны акадэмічны народны хор Беларусі імя Г. Цітовіча. Яны прадставілі музыку трох кампазітараў, братоў, — Мар'яна, Эміля і Станіслава Наско. А ў Малой зале імя Р. Шырмы прагучалі творы Міхася Шуміліна. З дня нараджэння гэтага кампазітара мінула 75 гадоў. Але імя яго, на жаль, паступова забываецца, з музычнай спадчыны на слыху, бадай, толькі "Мінскі вальс", у свой час вельмі папулярны. Зямное жыццё М. Шуміліна было кароткае — толькі 29 гадоў. Аднак музычны дар яго не знік бясследна. Хто ж не ведае сёння імя Ірыны Шумілінай! Заслужаная артыстка, салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі, сапраўдная чараўніца фартэпіяна, яна — таленавітая дачка кампазітара. І дзякуючы менавіта яе энтузіязму адбыўся гэты мемарыяльны вечар, падчас якога раскрыліся кранальныя старонкі камернай інструментальнай і вакальнай музыкі М. Шуміліна.

Праграма "Міхал Клеафас Агінскі і яго час", падрыхтаваная Ансамблем салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам У.Байдава, прысвячалася 240-годдзю з дня нараджэння нашага выдатнага земляка, прафесійнага дыпламата і высокаадукаванага кампазітара-аматара.

Наладжаная падчас фестывалю другая сустрэча з цыкла "Жывая класіка" прадставіла сумесны беларуска-галандскі праект пад назвай "Ноч месяцавых танцаў". Наш Акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам А. Анісімава прадставіў шэраг прэм'ер з новай галандскай музыкі. Выконваліся і творы беларускіх кампазітараў, якія выдатна спалучаюць традыцыі класікі з найноўшымі павевамі часу: Канцэрт Галіны Гарэлавай для аркестра і 11-ая сімфонія Дзмітрыя Смольскага.

Высокі міжнародны ўзровень фестывалю надаў Дзяржаўны камерны ансамбль "Кіеўскія салісты" на чале з народным артыстам Украіны Багадарам Катаровічам. Калектыў, які мае, без перабольшвання, сусветную славу, у Мінску выступіў упершыню і выканаў творы Ф.Мендэльсона і Д.Энеску.

Арганізатары "Беларускай музычнай восені" ўлічылі, што сёлета правядзенне яе супала з Годам культуры Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне. У сувязі з гэтым вылучыліся два канцэрты. Заслужаны артыст Расіі Аляксандр Фісейскі прапанаваў паслухаць усе фантазіі для органа, створаныя геніяльным Бахам, а маскоўскі піяніст Мікалай Луганскі — музыку Бетховена, Франка і Шапэна.

1 снежня ў Вялікай зале БДФ прайшоў канцэрт, прысвечаны 15-годдзю Мінскага дзяржаўнага аркестра духавых інструментаў "Няміга", які цяпер узначальвае Вячаслаў Міхновіч. Сваю гісторыю гэты папулярны калектыў вядзе ад студэнцкага духавога аркестра Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Яго стваральнік і першы кіраўнік А. Берын здолеў вывесці малады калектыў на міжнародны ўзровень. Аркестру "Няміга", які сёння выступае ў абноўленым складзе, падуладнае выкананне і сусветнага сімфанічнага рэпертуару, і папулярнага эстраднага, і арыгінальнай духавой музыкі, і класікі сусветнага джаза. З "Нямігай" працавалі дырыжоры Г. Праваторaў, П. Вандзілоўскі, В. Бартноўскі ды інш., іх замежныя калегі. Выступленні ўпрыгожваюць выдатныя салісты. У юбілейнай праграме, названай "Музыка сусветнага кіно", таксама ўдзельнічалі лепшыя вакалісты, у тым ліку і зоркі беларускай оперы, а за дырыжорскім пультам змянялі адзін аднаго нашы вядомыя маэстра.

С. ВЕТКА

З «Нашай музыкай»

З год таму я заўважыў на палічках музычных крамаў дыск пад назвай "Наша музыка 2". Прывабіў ён мяне складам выканаўцаў, сярод якіх значыліся маладыя таленавітыя гурты, напрыклад, "Neo", "Лангольеры", "Таxі" і інш. Добры гук, добрая падборка трэкаў — і да сёння я амаль не дастаю той дыск з плэера. Таму вестка пра выпуск трэцяй часткі "Нашай музыкі" прыспешыла мяне сустрэцца з Вольгай АРТ — музычным крытыкам, чалавекам, які спрычынены да гэтага праекта і ўдзельнічае ў адборы гуртоў для чарговага дыска.

Для пачатку — крыху гісторыі. Першы дыск "Наша музыка" быў выдадзены ў 2003-м годзе. Туды ўвайшлі гурты "J_Морс", "Чехов", "Indiga". Займаліся яго выданнем Раман Арлоў і Аляксандра Рогач. Прэзентацыя дыска прайшла ў сталічным клубе "Alcatraz". Спачатку "Наша музыка" была даволі "раскрутная" і продажная рэч, але пазней усё сціхла, бо праект пакінула Аляксандра Рогач, якая вылучалася добрымі арганізатарскімі здольнасцямі. Праз год з'явілася другая частка гэтага дыска, у падтрымку якога былі праведзены прэзентацыі ў клубах "Рэактар", "Стэп" і наладжаны шэраг канцэртаў з удзельнікамі. А цяпер на выхадзе і трэцяя частка.

— Якім жа чынам адбіраліся ўдзельнікі дыскаў "Наша музыка"?

— У часе падрыхтоўкі першага дыска на "Альфа-радыё" выходзіла ў эфір праграма "Наша музыка", дзе быў невялікі беларускі хіт-парад (славутай пастановы наконт "75 працэнтаў нашых выканаўцаў" яшчэ не было). Менавіта паводле вынікаў гэтага хіт-параду і выбіраліся ўдзельнікі. Да выхаду другога дыска праграма знікла, таму фарміраваць змест зрабілася цяжэй. А ўжо для трэцяй часткі нам даслалі каля 300 заявак.

— Хто з больш-менш знакамітых?

— "J_Морс", "Indiga", "Крама". "Лангольеры" мне гаварылі, што запісваюць новую песню... Дарэчы, шмат заявак з розных канцоў Беларусі.

— Якой павінна быць кампазіцыя, каб трапіць у "Нашу музыку 3"?

— Песня павінна быць адначасова і альтэрнатыўная, і прывабная для шырокага кола слухачоў — каб яе магла ўспрыняць зала з 700 чалавек, а не 2-3 з іх. У кампазіцыі павінна быць доля нейкай "хітовасці".

Немалаважны фактар адбору гуртоў — якасць гуку кампазіцыі. Гэта —галаўны боль многіх маладых музыкаў.

— Хто з'яўляецца прадзюсерам гуку "Нашай музыкі"?

— Аляксей Зайцаў. На ім — увесь мастэрынг ("маніпуляцыі" па рэгуліроўцы розных дарожак гуку, балансу, тэмбру. — **А.К.**) праекта. Дарэчы, на яго студыі запісваецца n-ая колькасць беларускіх выканаўцаў. Ён вельмі своеасаблівы чалавек. Можа, напрыклад, прыйсці да гурта і сказаць: "МНЕ гэта не падабаецца, таму ВЫ гэта перапішаце!". А ў выніку атрымліваецца дабраякасны прадукт.

— Дзе ў асноўным запісваюцца мінскія гурты?

— Зразумела, калі выканаўца самастойна выкарыстоўвае хатні камп'ютэр, ягоны запіс ніхто не возьме. Найбольш прымальны варыянт — запісвацца на студыі, дзе пакажуць, што ды як, зробяць добры мастэрынг. І мінскія гурты ў асноўным аддаюць перавагу студыям "X-noise-factory" Генадзя Сыракваша і "Mezzo forte" Аляксея Зайцава. Дарэчы, Зайцаў прадзюсіраваў апошні альбом "J_Морс", які зрабіўся самым продажным дыскам і меў вялікі поспех.

Як я зразумеў пасля размовы з Вольгай Арт, убачыць сваю назву на дыску "Наша музыка" можа амаль кожны беларускі калектыў. Незалежна ад таго, ці ветэран ён сцэны, як "Палац", ці малады, як "IQ48". Тым больш, што ў нашай краіне ёсць такія прадзюсеры, як Раман Арлоў, здольныя ахвяраваць свае грошы на "раскрутку" беларускай рок-музыкі.

Алесь КІРЫКОВІЧ

Фота забяспечана аўтарам

Цот ці лішка?

Каляднае апытанне

Шаноўныя прыхільнікі газеты, напэўна, і вы, як і супрацоўнікі рэдакцыі, застылі ў гэтыя снежаньскія дні на будзённым роздыху перад, здавалася б, нерэчаісным і яшчэ далёкім прывідам чарговых Калядаў (ці то каталіцкіх, ці то праваслаўных). А яны ўжо, аказваецца, вось-вось... Як піша Л.Салавей, спасылаючыся на бацьку Максіма Багдановіча Адама Ягоравіча, у энцыклапедычным слоўніку "Беларуская міфалогія": *"Каляда належыць да ліку святкаванняў сонечнага культу. Тут маецца поўны комплекс вялікага свята (гадавога): ачышчэнне жылля, сядзіб, мыццё ў лазні, спажыванне рытуальнай ежы, ахвяраванні і калектыўныя абрадавыя піры... (...) Атрыбутам Каляды можна лічыць арэхі, гульня з імі, якая мае характар варажбы – "цот" ці "лішка"..."*

Зразумела, што нас, людзей набліжаных да літаратуры, найперш цікавіць наша духоўнае *ачышчэнне* і самакрытычнае *мыццё*. Каб са спакойнай душой і чыстым сумленнем сесці нарэшце за рытуальнае *спажыванне* і з галавой абрынуцца ў абрадавы *пір*, найперш трэба будзе раздумацца над двума простымі пытаннямі:

— што найбольш нас уразіла і расчаравала ў 2005 годзе?

— у чым палягаюць нашы спадзяванні на наступны 2006 год?

Адным словам: *цот ці лішка*? З гэтымі пытаннямі мы і звярнуліся да маладых і старэйшых беларускіх літаратараў.

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ.

Нарадзіўся ў 1936 годзе на Беласточчыне – у вёсцы Лыскі. Скончыў Пінскае педвучылішча, вучыўся ў Мінскім дзяржаўным педінстытуце замежных моў. Працаваў у рэдакцыях часопісаў "Родная прырода", "Маладосць" і ў апараце СП Беларусі. Аўтар шматлікіх паэтычных зборнікаў, аповесцяў і рамана-даследавання "Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча".

Калі казаць пра радасці і засмучэнні мінулага літаратурнага года, дык яны, бясспрэчна, былі. Кожны напісаны верш, вядома ж, — радасць. Колькі вершаў — столькі і радасцяў. Гэта пры ўмове, што вершы атрымаліся, і ты імі задаволены, калі табе, як і раней, бліснула ў вочы паэтычнае натхненне. Я напісаў некалькі дзесяткаў вершаў розных жанраў — ад невялікіх дзіцячых казачак да іранічна-лірычных мініяцюр. Было некалькі публікацый — у "ЛіМе", "Вясёлцы", "Вожыку". Кожная такая публікацыя па-ранейшаму — радасць. Ва ўсялякім разе, для мяне. А вось сапраўднай творчай радасці — кніжкі — даўно не было. У 2004 годзе я адзначыў своеасаблівы юбілей — 15 гадоў з часу выхаду апошняга зборніка вершаў.

Можа, я мала пісаў? Не больш і не менш, чым раней. Я не падтрымліваю сваіх калег, якія не пішуць толькі таму, што, не маючы грошай, амаль немагчыма нічога выдаць. Калі ніхто нічога не чытае, зусім не цікавячыся ні паэзіяй, ні прозай.

І гэта — найбольшае засмучэнне, і яно, як відаць па ўсім, надоўга. Ну, скажыце, якая радасць, калі ты на свае апошнія зберажэнні выдаеш кніжку, а яна нікому непатрэбная! Нават у рукі ніхто не возьме, а не тое, каб купіць. Дык што рабіць у такім выпадку? Пісаць ці не пісаць?

Для мяне такога пытання не існуе: "я воспитан природой суровой" (Забалоцкі). Мяне ахоплівае шчымлівае замілаванне да кожнай расліннкі і кожнай кветачкі, бледнай і кволай, якая спрабуе расці і цвісці ў самых неспрыяльных умовах — без сонца, на пяску ці гліне і нават сярод камення.

Калі табе Бог даў нейкі талент, ты проста не маеш права, чалавечага права растраціць яго. Ты павінен рэалізаваць сябе, нягледзячы ні на што. Такі закон прыроды. І тым, хто не хоча пісаць "у стол", адказ у мяне адзін: *Не бойцеся пісаць у стол:*

Не толькі нехта
з небаракаў —
У стол пісаў
і сам Булгакаў.
Калі не прылятаў анёл.
Хоць стол бывае
без святла —
Як падзямелле ён нібыта,
Ды хіба Майстар
з Маргарытай
Прыйшлі да нас
не са стала?

А калі ты паэт, і ў цябе ёсць некалькі дзесяткаў вершаў ці перакладаў, значыць, ёсць і спадзяванне, што ты нешта надрукуеш. А ў кожнага, як і ў мяне, ёсць запаветнае спадзяванне на духоўнае, а можа, і нацыянальнае адраджэнне беларусаў, перш-наперш некалькіх пакаленняў маладых, якія, як бурлівыя марскія хвалі, хлынуць на бераг людскога жыцця і змыюць усё, што забруджвала яго ў чалавечае мора, якое мае магчымасць ачышчацца.

Ці зойме Кніга тое ж ганаровае месца, якое яна займала і раней? Пытанне, адказу на якое пакуль не маю.

Вадзім КОРАНЬ.

Нарадзіўся ў 1983 годзе ў горадзе Мінску. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка ў 2005 годзе. Друкаваўся ў часопісах "Крыніца", "Маладосць", тыднёвіку "ЛіМ" і ў зборніку "Дзень паэзіі"-2005".

2005 год прынёс шмат новага. Усе на год пасталелі, набраліся жыццёвага вопыту, магчыма, сталі разумнейшымі. Літаратура таксама не тапталася на месцы. Яе развіццё поўнасцю адпавядала развіццю грамадства, таму няма нічога дзіўнага ў тым, што ў літаратурным працэсе ніякіх асаблівых зрухаў, а тым больш узрываў, не адбылося. У 2005 годзе са сваімі творамі выступілі і маладыя літаратары, якія па-свойму даказваюць, што цікавяць маладых людзей не толькі камп'ютэры і дыскатэкі, але і літаратура. Прызнаныя майстры слова таксама стараліся трымацца на належным мастацкім узроўні.

У 2005 літаратурным годзе былі і радасці, і расчараванні, і... смутак. Уразіла і глыбока засмуціла заўчасная смерць беларускага Паэта Анатоля Сыса. Сыс для мяне заўсёды быў недасягальным, як зорка. І вось прыйшоў той момант, калі гэтая зорка растварылася ў цёмных нябёсах, пакінуўшы пасля сябе палоску святла – сваю паэзію, якая назаўсёды застанецца прыкладам беларускага прыгожага пісьменства для нашчадкаў (дай Божа, каб яны ўсё ж былі, гэтыя наступныя пакаленні БЕЛАРУСАЎ). Лёс Анатоля Сыса пераклікаецца з лёсам французскага паэта-сімваліста Арцюра Рэмбо, а таксама амерыканскага паэта Джыма Морысана (Рэмбо кінуў пісаць у 19 гадоў і зрабіўся гандляром, а Морысан памёр у 27 гадоў ад алкагалізму, так і не паспеўшы зрабіць усё, што задумаў). Аналізуючы біяграфіі і творчасць сусветна вядомых паэтаў, можна сказаць, што Сыс далучыўся да згаданых (і незгаданых) тут аўтараў не толькі сваім паэтычным лёсам, але і сваёй творчай спадчынай, якая не такая вялікая, як хацелася б, але вартая таго, каб узгадвацца ў кантэксце сусветнай літаратуры. Шчыра кажучы, я ніколі не бачыў Сыса ўвачавідкі, толькі дзесяткі разоў перачытваў ягоныя вершы. "Перад Богам", "Самотны", "Пацір", "Не хадзіце за мной...", "Агонь", "Страцім-Лебедзь"... Кожнае слова ў гэтых вершах дыхае Паэзіяй. А, можа, і добра, што я не сустрэўся з ім у жыцці, і ён так і застаўся для мяне ўсё той жа недасяжнай зоркай, адным з найлепшых беларускіх паэтаў. Чытаючы інтэрв'ю Анатоля Сыса і ўспаміны пра яго, адчуваеш безнадзейнасць і магчымую беспрасветнасць ягонага жыцця. І, напэўна, сімвалічна тое, што развіталіся з Паэтам у Доме літаратара зусім не пад жалобную музыку – 9 траўня людзям, якія святкавалі Дзень Перамогі, было, на жаль, не да памерлага Паэта. Сумна... Самотна... Але ёсць надзея, што ТАМ яму будзе лепш, чым было ТУТ...

Калі гаварыць пра расчараванні, то мяне, як чытача, вельмі расчараваў "Дзень паэзіі-2005", бо, шчыра кажучы, Паэзію ў гэтым зборніку вершаў знайсці можна, але вельмі цяжка (вядома, я не хачу нікога пакрыўдзіць, тым больш, што там выдрукаваны і мае вершы). Такое адчуванне, што Музы пакінулі паэтаў і словы Анатоля Сыса "...колькі б нас пасля Купалы не жыло – плюнеш – не паэты – самазванцы" – блізкія да праўды. Гэта агульнае ўражанне пасля прачытання. Яшчэ непрыемна было натыкацца ў такім гожым выданні на прыкрыя карэктарскія памылкі...

Што тычыцца радасных падзей у літаратурным жыцці, то прыемна было ўбачыць на паліцах кнігарняў выбраныя творы беларускіх класікаў у серыі "Беларускі кнігазбор", у прыватнасці, Ф.Аляхновіча. Я лічу, што даўно пара было выдаць творчую спадчыну таленавітага пісьменніка, які напісаў пра сталінскія рэпрэсіі значна раней, чым А.Салжаніцын.

Радуе і тое, што не забываецца спадчына М.Багдановіча. Музей Максіма Багдановіча працягвае ладзіць навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя творчасці паэта. У прыватнасці, напрыканцы лістапада адбылася канферэнцыя "Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст", на якой, апроч тэматыкі канферэнцыі, гаварылася пра выданне энцыклапедыі "Максім Багдановіч" і адначасна зважалася на цяжкасці, якія паўсталі на шляху гэтага выдання. Дай Бог, каб яны былі пераадолены і энцыклапедыя пабачыла свет, як пабачыў свет першы том энцыклапедыі беларускага фальклору, бо, калі захоўваецца духоўная спадчына народа, то будзе жыць і сам народ.

Вядома, парадавала і кніга ўспамінаў пра Уладзіміра Караткевіча, выдадзеная да 75-годдзя з дня яго нараджэння. Гэта знакавая падзея, бо такім чынам ушанавана памяць пісьменніка, які, будучы, па сутнасці, народным, так і не быў афіцыйна ўшанаваны гэтым ганаровым званнем.

Адным словам, у 2005 годзе было ўсякае... Але жыццё ёсць жыццё. Спадзяюся, што 2006 літаратурны год прынясе ў літаратуру нешта новае, яшчэ нязведанае, што слова стане на вагу золата і не будзе разбазарвацца направа і налева, як гэта робіцца цяпер, што Музы нарэшце знойдуць сваіх паэтаў... Я веру, што ўсё лепшае ў нас – наперадзе, а ўсё горшае – неўпрыкмет сыдзе і забудзецца, як дурны сон.

ВЫДАННІ

Кніжка Ірыны Шаўляковай **"РЭСТАЎРАЦЫЯ ШЧЫРАСЦІ"**, што пабачыла свет у выдавецтве "Логвінаў" (серыя "Другі фронт мастацтваў"), пазначаная аўтарам як *"літаратурна-крытычны канструктар"*, мае свае спецыфічныя адметнасці, а менавіта, як піша ў прадмове "Ад рэдактара" Юрась Барысевіч: *"Ірына не хавае сваёй суб'ектыўнасці: шукае ў часопісах і кнігах (каб затым паказаць чытачу) не столькі чужыя, колькі ўласныя думкі. Яна часцей за іншых беларускіх літаратуразнаўцаў скарыстоўвае навуковую тэрміналогію, але гэта не абцяжарвае ейныя рэфлексіі, а толькі падкрэслівае іх легкаважнасць, неабходную для інтэлектуальнага танца"*.

Нарэшце пабачыў свет другі том **"АНТАЛОГІІ МАЛДАЎСКАЙ ПАЭЗІІ"** (першы выйшаў у 2003 годзе). Выданне было спраўджана дзякуючы супрацоўніцтву Дэпартамента этнічных адносін Рэспублікі Малдова і Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Укладанне і біяграфічныя даведкі зрабілі Георге Мазілу і Уладзімір Скарынкін. Сярод перакладчыкаў Р.Барадулін, Т.Бондар, С.Законнікаў, К. Камейша, В.Зуёнак, В.Нікіфаровіч ды іншыя.

Анталогія польскай паэзіі XX стагоддзя **"НАПЯРЭЙМЫ: АД БУГА ДА ВАРТЫ"** (таксама ў двух тамах) пабачыла свет з дапамогай Польскага Інстытута ў Мінску. Падобнае выданне *"выходзіць упершыню, як і ўпершыню друкуецца большасць з яе 180 аўтараў, творчасць якіх ярка выявіла асаблівасці эстэтычных пошукаў польскай паэзіі мінулага стагоддзя"* і адрасуецца ўсім *"мілоснікам паэзіі"*, а таксама студэнтам і выкладчыкам філалогіі. Здзейсніў пераклады і напісаў прадмову вядомы паэт і доктар філалогіі Алег Лойка.

Анатоль ЗЭКАЎ

Усяму свой час

Сапраўды, ты ў мяне не адна,
Але радасць мая не сціхае.
Алесь ПІСАРЫК

Ты не даешся мне ніяк
У рукі, хоць фліртуеш часам.
Ты не адна ў мяне, аднак
З табою мы як быццам разам.

Не задзірай высока нос,
Бо ты не ведаеш, напэўна:
Ў мяне дзяўчат, калі ўсур'ёз,
Як на двары курэй у пеўня.

Ды аднаго ўжо не таю,
Хоць у кахання век кароткі,
Што непрыступнасць я тваю
Пераадолею усё-ткі.

Надыдзе неяк ён, той дзень,
Ці, можа, ноч (абы ўжо выйшла!),
Што і цябе, магчыма, дзе
Я таптану, як многіх іншых.

Коля і Лёня

На вуліцы Маркса, ў кватэры
Мятліцкага Колі
Я піў... І закусваў з патэльні...
І спаў як ніколі...
Леанід ГАЛУБОВІЧ

Зайшоў да Мятліцкага Колі
Ў кватэру.
Вядома,
З ім выпіў я так як ніколі —
Зваліўся ад стомы.

Кульнуўся адразу ж у ложак
Я сябру на радасць.
А Коля ўсё рыфмы трыножыў
Чарговай баладай.

Метафары гнаў у бяссонні,
Прышпорваў ляйчынай:
Пакуль, маўляў, спаць будзе Лёня,
Я спаць не павінны.

Назаўтра калі і прачнецца,
То будзе запозна:
Час вершаў для Лёні мінецца —
Пяройдзе на прозу.

Барыс КАВАЛЕРЧЫК

СЛОВЫ НА ПАПЕРЫ

Самая любімая праца пісьменніка — папяровая.

* * *

І на літаратурнай ніве бывае пустазелле.

* * *

Для аўтара непастаўленая камедыя можа ператварыцца ў драму.

* * *

Папера ўсё церпіць, калі яна туалетная.

* * *

Цікавая кніга тая, якую прачытваеш за адзін дзень, самая цікавая — якую перачытваеш усё жыццё.

* * *

Тэатр пачынаецца з вешалкі. Сямейны тэатр — з непрышытай жонкай вешалкі.

* * *

Пісьменнікі — людзі з вялікім уяўленнем. Але навошта ўяўляць сябе вялікім пісьменнікам?

Мікола ШАБОВІЧ

ЭПІГРАМЫ, ПРЫСВЯЧЭННІ

Беларускай песні і Міхаілу Фінбергу

А беларускай песні — быць!
Яна прарвецца з рыштаванняў
І на Еўропы скрыжаваннях
Так вольнакрыла закрыліць!
А хто ўсумніцца —
не дай божа, —
Маэстра Фінберг
дапаможа.

Навуму Гальпяровічу

Ты нарадзіўся ў Новы Год,
Хоць і ў Стары, але ж у Новы,
І, не шукаючы выгод,
Нясеш, як зніч, матулі слова.

Свае шануеш карані.
Ты знаўся з працаю любою.
Твая СТРУНА звініць праз дні,
І БРАМА кліча за сабою.

Хай лёс ад сцюжы захіне,
Сабакі Год не будзе горкі,
Няхай гарыць СВЯТЛО Ў АКНЕ,
Твае, Навум, хай свецяць зоркі!

Дзе б ты ні быў, куды б ні ехаў, —
Чуваць і ГОЛАС твой, І РЭХА!

Янку Лайкову
(аўтару кнігі "Вогнепаклоннік")

Вогнепаклоннікy Лайкову,
Знаць, лёс у рукі даў падкову,
Каб ён не гнуўся у дугу,
А гаварыў: "Я ўсё змагу!"
І змог. І ліры стаў палоннік.
Дзіця назваў:
"Вогнепаклоннік".

Раісе Баравіковай

Вядома кожнаму выснова:
Там поспех, дзе Баравікова.
І маладзее "Маладосць",
Калі такі рэдактар ёсць!

Таццяне Сівец (аўтарцы кніг "Праляцець па вясёлцы"і "Ліпеньская навальніца")

Цябе "хвалілі" так і гэтак
І той, хто спец, і хто не спец,
Ды кожны бачыў: між паэтак
Ёсць Таня, Танечка Сівец.
Жадаю рупнасці бясконцай
Тваёй не згаснуць па жыцці.
Хіба што толькі па вясёлцы —
Больш ні на чым не праляці!

Янусю Мальцу

Ты на ўсе рукі майстар-хват.
Нідзе ніколі не лайдачыў.
Стварыў пародый, вершаў шмат,
І Ведзьмака ты развядзьмачыў.

Навагодні тост

У Новы Год, Сабакі Год,
Дай бог нам жыць не па-сабачы!
Натхнення! Поспехаў! Удачы!
І новых твораў — карагод!

Малюнкі Алега КАРПОВІЧА

Міхась УЛАСЕНКА

Дробязі жыцця

Мой Пегас загнаны бытам, —
Ад працы паспрабуй зліняй!..
Вільне хвастом,
махне капытам —
Калі ўжо сеў,
дык паганяй!

* * *

Туманна ў гэтым свеце
І трывожна,
І спатыкнуцца,
І упасці можна;
Як па ільду —
Ступаем асцярожна,
А падаем —дык лаемся бязбожна.

* * *

Багацце — зло,
І гэта не пахвальна,
А беднасць —
І зусім адна брыдота!
Лайдак багаты —
Неяк даравальна,
Хто ж пашкадуе
Небараку-мота?

* * *

Навучаны з маленства
Лынды біць,
Быў хутка к гэтай справе
Прыахвочаны;
І цяпер ад нечага рабіць
Пастаянна чымсьці
Заклапочаны.

* * *

Дзеля жыцця свайго —
Не дзеля славы, —
Касталомы рвуцца
У кастаправы.

* * *

Калі жыццё не ўдалося,
Значыць, яно у, далося!

* * *

Лёсам нам дадзена: вечна
Спрачацца аб тым,
Што бясспрэчна.

Жарты-жартачкі...

Сур'ёзнае і смешнае жывуць побач — такі напісаны, мудры закон зямнога чалавечага існавання. Адметная, бясспрэчная дыялектыка грамадскай раўнавагі, дзякуючы чаму падтрымліваецца неабходны баланс супольных эмоцый і абнаўляецца патэнцыял стваральнай энергіі людзей.

А вельмі часта бывае і так, што менавіта сур'ёзнае, выказанае з "прэтэнзіяй" на важкасць думкі, у пэўных абставінах выглядае неверагодна смешным, хутка набывае шырокі розгалас, а "гаспадар" слоў становіцца "славутым".

Пра гэта — замалёўкі з натуры, рэальныя жыццёвыя факты, сведкам якіх быў я сам або пра якія расказалі мне блізкія людзі. "Жарты-жартачкі..." — так я назваў цыкл занатаваных у розны час гісторый-мініяцюр. Некаторыя з іх прапаную вашай увазе.

Аўтар.

* * *

Ёсць сярод нас людзі, якія змалку прывучыліся хлусіць, і гэта стала іх хранічнай хваробай. Так, хваробай, бо псіхічна здаровы чалавек не стане знарок нешта выдумляць, каб увесці ў зман іншых.

Хлусня, вядома, бывае розная: карыслівая, калі падманшчык хітрыць, каб выкруціцца з якой-небудзь непрыемнай для яго сітуацыі; помсліва-здзеклівая, каб схаваць ад саперніка сапраўдны змест інфармацыі; маўклівая, калі нейкі факт наўмысна замоўчваецца або калі на запыт пра яго наяўнасць хлус нейтральна паціскае плячыма ці адмоўна ківае галавой — маўляў, не ведаю. А нярэдка сустракаюцца выдумшчыкі найвышэйшага гатунку, для якіх хлусня — неад'емны элемент гаворкі, рэч звыклая, як папіць вады, паесці ці паспаць. Праўда, і мана ў іх словах перамешваецца так лоўка і непрыкметна, што не адразу і сцяміш, як яно на самай справе.

Жыў і ў нашай вёсцы такі чалавек. Працавіты, дбайны гаспадар. Ушаноўвалі ў калгасе як перадавога трактарыста і камбайнёра. І ў сям'і галава, і сусед добры. Ад чужой бяды ніколі не адвернецца. І ў той жа час — неймаверны фантазёр-хлус, за што і атрымаў ад вяскоўцаў другое прозвішча — "лыгун".

Ведаючы пра яго хлуслівы нораў, вясковыя мужчыны час ад часу, папярэдне пераміргнуўшыся, падкідвалі яму тэму для чарговай выдумкі.

Згадваюць, прынамсі, такое...

Перад Калядамі ёсць у вяскоўцаў прыемны клопат — калоць парсюка. Тут аднаму гаспадару не ўправіцца, таму памагаюць сваякі ці суседзі. Быў аднойчы сярод памагатых і той самы хлус. Ацэньваючы вагу парсюка, адзін з мужчын, вядомы ў вёсцы жартаўнік, па-змоўніцку, прамовіў:

Дагледжанае свінчо — на два цэнтнеры пацягне. Ды што тут асаблівага — дзеля гэтага яго цэлы год і кармілі. — І пасля кароткай паўзы дадаў: — Бывае і заяц, як ладны падсвінак. Калі я служыў на Далёкім Усходзе, мы забілі шарака кілаграмаў пад трыццаць.

На што, не міргнуўшы вокам, "лыгун" сказаў:

Вот дзіва!.. Я і большага бачыў — пудоў мо чатыры ці пяць...

* * *

Разуменне жарта ў кожнага сваё. Часам гэта робяць спадцішка, ананімна, наўмысна хаваючы жарт, бо ён па сутнасці сваёй скіраваны на тое, каб прынесці камусьці "невялічкую" непрыемнасць — штучна стварыць нейкую недарэчную сітуацыю, а потым пасміхацца з чалавека, які ў яе трапіў.

Адзін такі жартаўнік-ананім мне расказваў:

— Курс маладога байца ў арміі не абыходзіцца без муштроўкі. Асаблівае напружанне ў казарме падчас адбою. Паспець адзецца ці распрануцца за 45 секунд на пачатку службы могуць не ўсе. Каманду сяржанта "Адбой!" або "Пад'ём па поўнай форме!" выконваюць па шмат разоў. Пасля агульных ротных трэніровак сяржант займаецца індывідуальна з тым навабранцам, які не ўкладваецца ў нарматыў. Праз тыдні два няздольных фактычна не застаецца.

Побач са мною ў казарме (я спаў над ім, на верхнім ярусе) аказаўся не вельмі рухавы малады салдат, радавы Пракаповіч, які перабіраў нарматыўныя секунды. Сяржант доўга вучыў яго гэтай няхітрай навуцы і разам з усімі, і асобна. У час агульнай трэніроўкі, калі мы, склаўшы абмундзіраванне, кідаліся ў ложак, я паспяваў нябачна перавярнуць пілотку саслужыўца зорачкай назад. Сяржант тут жа падымаў бедалагу. На наступны дзень мною непрыкметна мог быць адсунуты бот. І так паўтаралася не адзін раз. Зноў і зноў камандзір дамагаўся дакладнага выканання свайго загаду, а Пракаповіч злаваўся ўсё болей і болей. А ў гэты час рота затоена назірала за інцыдэнтам паміж сяржантам і радавым.

У рэшце рэшт вымуштраваны аднапалчанін сцяміў што да чаго і пачаў падазраваць ў махлярстве радавога Заварзіна, які спаў побач на першым ярусе. Той, вядома, аднекваўся...

За месяц-другі Пракаповіч стаў выконваць каманду "Адбой!" лепей за многіх, хоць рота пасміхалася з яго ледзь не да самай дэмабілізацыі.

Што жарты-кпіны потайкам рабіў я, да заканчэння службы ніхто не ведаў...

* * *

Наша настаўніца рускай мовы Нэля Паўлаўна, па тым часе яшчэ малады педагог, любіла практыкаваць пры замацаванні матэрыялу пройдзеных тэм так званым апытаннем класа. Выходзіш да дошкі, і табе клас задае пытанні. Часцей у такіх выпадках выклікаліся слабейшыя вучні. Адным з іх быў Яша Гарэлік. Каб выправіць некалькі запар атрыманых двоек, яго выратаваць магла толькі найвышэйшая адзнака. І мы з усіх сіл стараліся яму дапамагчы: пытанні задавалі самыя лёгкія, самыя просценькія. А Яша, на агульную радасць, адказваў бадзёра і ўпэўнена. Пасля пятага пытання клас хорам запатрабаваў:"Пяцёрку!" Настаўніца, відаць, і сама чакала такога фіналу і з задавальненнем выставіла "кругленькую" ў Яшын дзённік.

Як толькі празвінеў званок на перапынак, Яша з дзённікам у руках выбег з класа. І на наступных уроках у той дзень не прысутнічаў. А назаўтра растлумачыў прычыну свайго знікнення: бегаў па абяцаны бацькам пачастунак — атрымаў за "пяцёрку" кавалак кумпяка...

А ў пасляшкольным жыцці Яша, напэўна, лепш за нас ведаў геаграфію: лёс закінуў яго аж на Камчатку, дзе ён працаваў докерам і спяваў у партовым хоры.

Праўда, потым ён вярнуўся ў родную вёску. На жаль, яго зямны шлях скончыўся рана: летняя спёка падштурхнула неабачліва кінуцца ў возера.

* * *

Аднойчы, калі Алесь Пісьмянкоў рэдагаваў "Вожык", мы доўга гулялі з ім вечарам па Мінску, і я прапанаваў яму зайсці да мяне на кватэру на кубачак кавы. Ён доўга аднекваўся, але ў рэшце рэшт згадзіўся.

Дома была толькі цешча, якая, як вопытная гаспадыня, добра ведала, што кавай мужчынская размова не абмяжуецца, і хуценька выставіла на стол усё, што ў той вечар магла, каб пачаставаць госця. Мы вырашылі пасядзець-пагаманіць на кухні.

Гутарка за чаркай пайшла жывей і, як часта ў такіх выпадках бывае, зацягнулася амаль да апаўночы. Цешча, вядома, захацела спаць, і, лічачы патрэбным яшчэ раз падкрэсліць сваю павагу да госця, зайшла ў кухню, але з нечаканым для нас паведамленнем:

— Вам, госцейка, я пасцяліла ўжо. Будзеце спаць у зале на канапе. Там у нас лёгка спіцца. На світанні з Камсамольскага возера струменіць свежае паветра, настоенае на травах...

— Дзякуй, але я паеду начаваць дадому, — разгублена і расчулена прамовіў Алесь. — Я жыву ў Мінску...

А я думала, што што наш госць прыехаў з вёскі. Па-беларуску гаворыце, — пацінула плячыма цешча.

Мы з Алесем доўга рагаталі.

Начаваць ён паехаў дадому.

Гэты эпізод ён часта згадваў, перадаючы маёй цешчы нізкі паклон і найлепшыя пажаданні за яе "беларускую" гасціннасць.

* * *

На пачатку 80-х гадоў мне давялося наведаць В'етнам у складзе турысцкай групы. З намі працавалі, пазменна, два мясцовыя перакладчыкі: Фам — в'етнамец і Кім — хлопец карэйскага паходжання. Лепей рускую мову ведаў Фам, які скончыў Валгаградскі педінстытут. Кім вывучаў "великий и могучий» у Ханойскім універсітэце, гаварыў па-руску значна горш.

Аднойчы нас павезлі на экскурсію ў сельскагаспадарчы кааператыў — невялікую гаспадарку, якую арганізавалі гадоў пяць таму, пасля выгнання з в'етнамскай зямлі амерыканскіх агрэсараў. На свінаферме, дзе было ўсяго каля 50 галоў падсвінкаў, нам з гонарам паказалі пародзістую свінню. Фам пераклаў словы кіраўніка кааператыва так:

Гэтую маці свіней завезлі сюды з Савецкага Саюза...

Мы дружна зарагаталі. Сумеўся Фам, насупіўся гаспадар — ім цяжка было зразумець прычыну нашага смеху.

Пазней, згадваючы гэтую гісторыю, я падумаў: "З чаго мы смяяліся?! Гэта ж быў самы дакладны пераказ, з найвялікшай пашанай да мацярынскасці..."

* * *

Мой калега-дыпламат суправаджаў групу беларускіх журналістаў, якія прыехалі ў Маскву для асвятлення пасяджэння саюзнага ўрада. Форум міністраў абедзвюх краін, як і звычайна на расійскай тэрыторыі, праходзіў у Белым доме. У такіх выпадках існуе пэўны парадак допуску карэспандэнтаў, які, зрэшты, нічым не адрозніваецца ад агульных правілаў праходу ў будынак расійскага кабінета міністраў.

Усе неабходныя заяўкі былі своечасова афармлены і прадстаўнікі прэсы нашай краіны, прад'явіўшы беларускія пашпарты, бесперашкодна адзін за адным праходзілі цераз прапускны пункт на ўрадавую тэрыторыю. Калі ланцужок землякоў скончыўся, дыпламат мусіў засведчыць сябе, паказаць супрацоўніку Федэральнай службы аховы свой асабісты дакумент. Той доўга разглядаў дыпламатычны пашпарт, нешта пільна вычытваў і ў рэшце рэшт прамовіў: "Праходзьце".

Да пачатку прэс-канферэнцыі, якую абяцалі наладзіць пасля пасяджэння, заставалася яшчэ багата часу, і карэспандэнты былі вымушаны так-сяк бавіць яго ў калідорным чаканні.

Адзін з іх звярнуўся да дыпламата з нечаканай просьбай:

— Аляксандр Іванавіч, пакажыце, калі можна, дыппашпарт. Я ніколі не бачыў гэты дакумент.

Вядома, можа, нічога сакрэтнага ў ім няма, — адказаў супрацоўнік Пасольства і працягнуў зялёную кніжачку.

Журналіст, як і ахоўнік на КПП, пачаў уважліва разглядаць тое, што яму даверылі патрымаць у руках. З галоўнай пашпартнай старонкі на яго спадылба пазірала насупленае дзіця — чатырохгадовы Арцём, сын дыпламата. Праз хвіліну ён спытаў:

— І гэты дакумент быў прад'яўлены ахоўніку?

— Гэты, а які ж яшчэ?!

Карэспандэнт выбухнуў гучным смехам і схапіўся за жывот — такога рогату сцены Белага дома, напэўна, дагэтуль не чулі.

Прысутныя ўмомант павярнулі галовы туды, дзе заходзіўся ад смеху весялун. Дыпламат, які стаяў побач з ім, паціснуў плячыма: маўляў, нічога не разумею. А журналіст яшчэ доўга не мог стрымацца, пакуль, відаць, не сцяміў, што знаходзіцца не на канцэрце "Аншлага".

Крыху супакоіўшыся, мінскі "летапісец" вярнуў дыпламату яго "асабісты" дакумент.

— Выдатна ахоўваюць Белы дом... Чатырохгадовы тэрарыст пройдзе сюды без праблем, — прамовіў ён, выціраючы хусцінкай слёзы.

Пасля гэтых слоў зарагатаў і дыпламат, зразумеўшы сваю памылку: спехам збіраючыся на працу, ён паклаў у кішэнь не свой дыппашпарт, а сына.

Іван КАРЭНДА



Даўнія традыцыі

Новы год, бадай, самае доўгачаканае, таямнічае і загадкавае свята, якое стала ўвайшло ў наша жыццё разам з традыцыйнымі Дзедам Марозам і Снягуркай, падарункамі і прыгажуняй елкай. Але ж традыцыі — справа не спаконвечная, яны, як вядома, не абрынуліся з нябёсаў, а ўсталёўваліся, развіваліся ды набывалі тую ці іншую форму ў розных народаў у розныя часы.

Не выключэнне і Новы год. Яго святкаванне ў старажытных народаў заўсёды звязвалі з пачаткам адраджэння прыроды, якое адбывалася ў сакавіку. Так, напрыклад, у Месапатаміі гэта падзея адзначалася карнаваламі, шэсцямі і маскарадамі. Рымляне таксама сустракалі свята адраджэння ў сакавіку, пакуль у 45 годзе да н.э. Юлій Цэзар не ўвёў новы каляндар, у якім Новы год прыпадаў на першага студзеня (першы месяц быў названы ў гонар рымскага бога Януса, які меў два твары і адначасова глядзеў у мінулы год і наступаючы). І ў Кіеўскай Русі ў 988 годзе з наданнем хрысціянству статуса дзяржаўнай рэлігіі, гэта свята пачало адзначацца першага сакавіка. А пачаткам адліку паслужыў "дзень стварэння Адама" (пятніца першага сакавіка першага года ад стварэння свету).

У 1492 годзе вялікі князь Іаан Васільевіч Трэці пацвердзіў пастанову Маскоўскага (Нікейскага) сабора лічыць пачаткам Новага года (як царкоўнага, так і грамадзянскага) першага верасня на Старажытнай Русі і ў іншых усходнеславянскіх народаў. Для надання гэтаму дню большай урачыстасці сам цар напярэдадні з'яўляўся ў Крамлі, дзе кожны жадаючы, незалежна ад свайго сацыяльнага становішча, мог падыходзіць да яго і шукаць праўды, абароны ці міласці.

Так было да дзевятнаццатага снежня 1699 года, калі цар Пётр I выдаў указ святкаваць Новы год не з дня стварэння свету (у Расіі быў 7207 год), але з Ражства Богачалавека. Ва ўказе адзначалася: "Поелику в России считают Новый год по-разному, с сего числа перестать дурить головы людям и считать Новый год повсеместно с первого января. А в знак доброго начинания и веселия поздравить друг друга с Новым годом, желая в делах благополучия и в семье благоденствия. В честь Нового года учинять украшения из елей, детей забавлять, на санках катать с гор. А взрослым людям пьянства и мордобоя не учинять — на то других дней хватает".

Трэба адзначыць, што новыя навагоднія звычаі прыжыліся ў славян даволі хутка, бо на той час раней прыпадалі святкі. Таму многія старажытныя паганскія абрады, гулянні, выбрыкі пераапранутых, а таксама катанне на санях ды варажба апоўначы выдатна ўпісаліся ў рытуал сустрэчы Новага года.

Акрамя выбрыкаў пераапранутых ды гулянняў, часцяком "маскіраваліся" пад розных жывёл або вадзілі саміх жывёлін з сабою. Ва Украіне і Беларусі асаблівай папулярнасцю карысталася каза і шэсце з ёю. Вось як, напрыклад, гэта адбывалася ў Мінскай губерні. Некалькі маладых хлопцаў збіраліся ў якой-небудзь хаце, пераважна ў маласямейнай, каб "прыбіраць казу". Самага кемлівага хлопца апраналі ў вывернуты кажух, на ногі ўсцягвалі другі кажух, таксама вывернуты. Усё гэта замацоўвалася на поясе вяроўчынай. Твар маладзёну выпэцквалі сажаю або надзявалі маску. На галаву начабурвалі спецыяльную шапку, да якой былі прыладжаны рогі, сплеценыя з саломы або лазы. І апошні штрых — хлопцу ў рукі давалі вупражную дугу, на якую ён садзіўся. Пастаяннымі спадарожнікамі казы былі дзед, цыган ды музыкант са спевакамі. У "дзеда" прыбіралі таксама маладога хлопца. Акрамя старой падранай вопраткі, у якую яго апраналі, на твар ладзілася маска з бярозавай кары з бураком замест носа і пасмамі льну замест барады. "Дзед" дурэў, займаў гаспадара вясёлымі размовамі, частаваў яго попелам замест тытуню.

Пасля адбывалася відовішча: каза пад спевы паварочвалася рознымі бакамі. А пяялася пра тое, што жывёлу хочуць адлупцаваць. Пад словы песні "ой ударыў козаньку" адзін з натоўпу біў казе па рагах, якая валілася і ляжала да таго часу, пакуль спевакі не даходзілі да слоў "здароваю стала". Тут каза раптоўна падымалася, кланялася гаспадару і распачынала танчыць. У гэты момант пачыналі іграць на скрыпцы пад акампанемент бубна, дагэтуль жа іграла толькі на скрыпцы. Шэсце суправаджалася спевам: "дзе каза ходзіць, там жыта родзіць, дзе каза хвастом, там жыта кустом, дзе каза рогам, там жыта стогам". Такім чынам імкнуліся перадаць сілу і пладавітасць жывёлы ўрадлівасці зямлі, паміж якімі не рабілі ніякай розніцы.

Цяпер такое відовішча ў нашай краіне сапраўдны рарытэт не толькі ў горадзе, але і на вёсцы. Але ж традыцыя ўпрыгожвання лясной прыгажуні елкі засталася, хаця яна і прыўнесеная ў нашу культуру. Раней у славян меўся свой выдатны звычай: да дня навагодняга свята ў кадушках вырошчвалі квітнеючыя вішні. І на Новы год у доме духмяна пахла ды лашчыла вока пакрытая бела-ружовымі пяшчотнымі пялёсткамі славянская навагодняя вішня.

Безумоўна, Новы год — доўгачаканае і любімае ўсімі свята. Хтосьці святкуе дома разам з сям'ёй, хтосьці ідзе да сяброў ці ў рэстаран або начны клуб, а нехта вымушаны і працаваць. Але не сумуйце, ёсць магчымасць адзначыць свята і ў іншы дзень, бо не ўсе сустракаюць яго ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня.

У Грэцыі, напрыклад, Новы год супадае з нашым Старым Новым годам і адзначаецца 14 студзеня. Ён мае назоў — Дзень святога Васіля.

Наступным свята прыходзіць у некаторыя краіны ў адпаведнасці з месяцовым календаром. Гэты Новы год не мае фіксаванай даты, бо адзначаецца з першым веснавым маладзіком (між 21 студзеня і канцом лютага). Традыцыя сустракаць Новы год па месяцовым календары існуе ў Кітаі, Малайзіі, В'етнаме, Сінгапуры, Карэі, Манголіі, а таксама сярод прыхільнікаў будызму ў іншых краінах.

Мусульманскі Новы год — Хіджра — прыпадае на першы дзень першага месяца мусульманскага года, але штогод гэта дата мяняецца.

Увесну таксама можна святкаваць. Наўруз — такая назва першага дня новага года па персідскім календары. Ён адзначаецца ў ноч з 21 на 22 сакавіка, у дзень веснавога раўнадзенства, насельніцтвам Афганістана ды Таджыкістана, якія размаўляюць на мовах персідскай групы, а таксама ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, Іране, Пакістане і Азербайджане.

Прадоўжыць святкаванне можна адразу ж на наступны дзень — 22 сакавіка, як гэта робяць у Індыі. Індыя сапраўдны рэкардсмен — для Новага года тут аж восем дат. Напрыклад, у дзень Гудзі Падва неабходна паспытаць лісце дрэва нім-нім (на смак вельмі непрыемнае ды горкае). Па старажытным паданні, ужыванне лістоты ахоўвае чалавека ад усялякіх хвароб і ліха, забяспечваючы, як ні дзіўна гучыць, салодкае жыццё.

Трынаццатага красавіка свята прыходзіць у Шры-Ланку і Непал. На наступны дзень — у Лаос.

Далей Новы год — 16 ліпеня — сустракаюць плямёны майя. У Джыбуці і Нігерыі свята адзначаецца ў жніўні. Першага верасня святкуюць у Сірыі. Таксама восенню прыходзіць яўрэйскі Новы год. 11 верасня наступае свята ў Эфіопіі, якое супадае з заканчэннем сезона дажджоў.

У Гамбіі свята прыпадае на 7 кастрычніка. У кастрычніку ж святкуюць і ў Інданезіі: людзі апранаюць лепшыя рэчы і просяць адзін у аднаго прабачэння за непрыемнасці, якія яны зрабілі ў мінулым годзе. 18 лістапада Новы год завітвае ў Йемен. Таксама ў сярэдзіне лістапада адзначаюць свята ў Акеаніі і на Гавайскіх астравах.

Вось бачыце, святкаваць можна амаль круглы год. Выбар за вамі. Галоўнае, каб свята было прыемным ды запамінальным, нягледзячы на тое, дзе або з кім вы яго сустракаеце. І абавязкова загадайце жаданне, бо навагодняя ноч сапраўды чарадзейная. А цуда, кажуць, не міраж, яно існуе. Трэба толькі верыць у яго. Верце, усё ў вас спраўдзіцца, а наступны год будзе лепей за мінулы. А ці можа быць інакш?

В. КАВАЛЁЎ

Фота забяспечана аўтарам

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны смерці дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" Таісы Мікалаеўны БОНДАР і выказвае глыбокае спачуванне яе родным і блізкім.

Калектыў выдавецтва "Мастацкая літаратура"глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядомай беларускай пісьменніцы, дырэктара РВУ "Літаратура і Мастацтва" Таісы Мікалаеўны БОНДАР. Шчыра спачувае яе родным і блізкім.

Пайшла з жыцця выдатны паэт, празаік, публіцыст — Таіса Мікалаеўна БОНДАР, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне", дырэктар Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і мастацтва", выдатны чалавек і грамадскі дзеяч. Смутак і боль зімовым ранкам 19 снежня напоўніў сэрцы родных, сяброў, паплечнікаў, калег. І ўсё ж час зямны для Таісы Мікалаеўны не спыніўся. Яна назаўсёды застанецца ў нашай памяці, у сваіх таленавітых творах. Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырае, сардэчнае спачуванне родным і блізкім Таісы Мікалаеўны ў сувязі з яе заўчаснай смерцю.

Саюз пісьменнікаў Беларусі

Супрацоўнікі Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" глыбока смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці дырэктара Таісы Мікалаеўны БОНДАР і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.Светлая памяць пра Таісу Мікалаеўну Бондар, выдатнейшую пісьменніцу, таленавітага кіраўніка і прыгожага чалавека захаваецца ў нашых сэрцах.

Рэдакцыйная калегія і калектыў часопіса "Дніпро" з пачуццём глыбокага смутку ўспрынялі вестку аб смерці вядомай беларускай пісьменніцы, дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва", добрага сябра Украіны і нашага часопіса Таісы Мікалаеўны БОНДАР і схіляюць свае галовы перад яе светлай памяццю.

Рэдакцыя часопіса "Вожык" глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядомай беларускай пісьменніцы, дырэктара РВУ "Літаратура і Мастацтва" Таісы Мікалаеўны БОНДАР і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

Пасольства Індыі ў асобе спадара Р.К. Ц'ягі, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь, усіх супрацоўнікаў Пасольства і шматлікіх індыйскіх сяброў выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" Таісы Мікалаеўны БОНДАР з прычыны яе заўчаснай смерці.Пасольства Індыі смуткуе разам з сям'ёй Таісы Мікалаеўны Бондар і ўпэўненае ў тым, што светлая памяць пра яе будзе вечна жыць у сэрцах усіх, хто ведаў яе.

Расійскія пісьменнікі, супрацоўнікі часопіса "Наш современник" смуткуюць з прычыны смерці найвыдатнага паэта братняй Беларусі, таленавітага арганізатара літаратурнага працэсу, здольнага і паспяховага выдаўца Таісы Мікалаеўны БОНДАР.

Рэдакцыю часопіса "Наш современник" звязвалі з Таісай Мікалаеўнай доўгія гады сяброўства і маштабныя праекты выдання супольных нумароў "Нашего современника" і беларускага часопіса "Нёман". Яна была душой гэтай патрэбнай і адказнай працы.

Вечная памяць яркаму таленавітаму чалавеку! Вечны спакой узнёслай светлай душы!

Станіслаў Куняеў,
Аляксандр Казінцаў

СВЯТЛО СВЯТЫНІ





Свята. Святое. Святло... Таемнае і радаснае сугучча роднасных слоў чулася ў поліфаніі падзеі, знамянальнай для гісторыі галоўнай каталіцкай святыні Беларусі, для духоўнага жыцця вернікаў, для адраджэння, захавання і развіцця айчыннай культуры.

Мінская архікатэдра Імя Найсвяцейшай Панны Марыі падзяліла лёс многіх святых муроў на зямлі нашай. Пра гэты касцёл — архітэктурны помнік XVIII ст., віхурай гісторыі знявечаны, але не знішчаны, — пісаў "ЛіМ" амаль два гады таму, калі падзея, што адбылася 10 снежня 2005г., была яшчэ толькі ў марах. Вядома, з 1994 па 1997г. польскія спецыялісты пад кіраўніцтвам архітэктара В.Вілька пры супрацоўніцтве з Беларускім камітэтам аховы помнікаў правялі значныя рэстаўрацыйныя работы. Але аднаўленне святыні — справа доўгачасовая... Знамянальна, што завяршэнне яе чарговага перыяду супала з падрыхтоўкай да свята Нараджэння Хрыстова. Узноўлены галоўны алтар архікатэдры, паміж калонамі якога паўсталі драўляныя скульптуры апосталаў Пятра і Паўла, вырабленыя італьянскімі майстрамі. Каштоўныя фрэскі, адрэстаўраваныя за кошт дзяржавы, дапоўнілі тыя, што раней былі адноўленыя намаганнямі Касцёла. На хорах размясціўся новы трохмануальны арган аўстрыйскай фірмы "Pflüger Orgelbau" — дар Епіскапата Аўстрыі. У храме з'явіўся жывапісны абраз Імя Марыі Беззаганна Зачатай, летась асвечаны на плошчы святога Пятра ў Рыме Папам Янам Паўлам II, які перадаў гэтую святыню ў дар беларускаму касцёлу з пажаданнем, каб абраз быў каранаваны.

І вось арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі кардынал Казімір Свёнтак разам з усімі беларускімі біскупамі, прадстаўнікам епіскапату Аўстрыі, шматлікімі святарамі з розных дыяцэзій Беларусі, цэлебраваў урачыстую Імшу, напачатку прывітаўшы ўдзельнікаў падзеі. Сярод іх былі прадстаўнікі Беларускага Экзархата братняй Праваслаўнай Царквы, дзяржаўнай улады, замежныя дыпламаты. Адбылося асвячэнне рэканструяванага алтара і аргана, велічны рытуал каранацыі абраза.

Кардынал К. Свёнтак, падзякаваўшы ўсім, хто адданаю працаю, ахвяраваннямі і малітвамі паспрыяў адраджэнню архікатэдры, у прыватнасці, сказаў (фрагмент яго прамовы — на сайце catholic.by): "Асаблівую падзяку ад імя мінскай архікатэдральнай парафіі і ўсяго Касцёла ў Беларусі я скіроўваю Святому Айцу Яну Паўлу II, які — я ўпэўнены — глядзіць на нас з дому Нябеснага Айца і падзяляе з намі гэтую вялікую радасць. Няхай падараваны і асвячоны Вялікім Папам абраз Імя Марыі Беззаганна Зачатай будзе для Касцёла ў Беларусі і ўсяго нашага народа бачным знакам няспыннай апекі Найсвяцейшай Багародзіцы. Словы падзякі адрасую Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку і прадстаўнікам дзяржаўных уладаў і арганізацый за дапамогу ў аднаўленні роспісаў у цэнтральнай наве..."





Старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў РБ С.Буко, звярнуўшыся да прысутных, адзначыў намаганні, якія прыкладае кіраўніцтва Беларускага Касцёла і асабліва Яго Эмінэнцыя кардынал Казімір Свёнтак, чыя самаахвярная праца з'яўляецца важкім укладам у духоўную скарбніцу нашай Айчыны. Беларуская дзяржава вельмі ўдзячная кардыналу за тую дзейнасць, якую ён ажыццяўляе ў імя беларускіх вернікаў і нашага грамадства. Дзяржава прызнае важкі ўклад Касцёла ў развіццё нацыянальнай культуры нашага народа, у падтрыманне маральнасці і духоўнасці ў грамадстве і вылучае сродкі для аднаўлення касцёлаў. У наступным годзе будуць выдаткаваны яшчэ больш значныя сродкі на завяршэнне рэстаўрацыйных работ у архікатэдры.

...Упершыню гучаў асвечаны арган: музыка Моцарта суправаджала ўзнёслыя хвіліны падзеі.

С.Б.

Фота В. Харчанкі

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856. Наклад 2901
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 21.12.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1541

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2006 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц —4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 5200 руб.
на 4 месяцы — 10400 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 5000 руб.
на 6 месяцаў — 15000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.